ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 252 (3360) Субота, 2 лістапада 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ТОКІЁ, 1. З Харбіна паведамляюць аб тым, што арышты савецкіх грамадзян працягваюцца. Арыштавана звыш 30 чалавек і прызначана да арышту яшчэ каля 100 асоб. Арыштаваных нячувана катуюць і прымушаюць падпісваць паліцэйскія пратаколы, у якіх зазначаецца „аб змове супроць кітайскіх улад“.

НАВІНЫ В. С. С. Р.

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.) Загатоўка бульбы па акрузе выканана на 100 проц. і раней тэрміну. З выкананьнем хлебазагатовак адстае Хлебасаюз. Акрсельсаюз заняў першае месца.

БССР выканала поунасьцю і раней тэрміну плян адгрузкі бульбы у пралетарскія цэнтры Саюзу

Чырвонымі абозамі, эшалёнамі бульбы працоўныя БССР яшчэ раз прадэманстравалі непарыўную сувязь іх з партыяй і з працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу

З такой-жа энэргіяй вырашым баявую задачу дня---узмацненьне загатовак ільну і датэрміновае выкананьне пляну хлебазагатовак

У адказ на заклік партыі

Рабочыя і бядняцка-серадняцкае сялянства БССР яшчэ раз прадэманстравалі непарыўнасьць сувязяй са сваёй партыяй, са сваім урадам, з усімі працоўнымі Саюзу.

Партыяй быў кінуты лёзунг узмацніць загатоўкі бульбы, забясьпечыць ёю пралетарскія цэнтры Саюзу. Арганізаванай воляй працоўных БССР, гэты лёзунг ажыцьцёўлены.

Заданьне па адгрузку бульбы на працягу восені ў разьмеры 4.000.000 пудоў Беларусь **выканала** поўнасьцю і раней тэрміну. Гарады БССР забясьпечаны бульбай на ўсю зіму.

Заклік партыі і ўраду мабілізаваў шырокія колы савецкай грамадзкасьці. Рабочыя фабрык і заводаў паслалі вёскі брыгады. Беднота, сераднякі, калгасы і саўгасы адказалі ўзмоцненым падвозам бульбы чырвонымі абозамі. Паслана звыш нармальнай адгрузкі 8 чырвоных эшалёнаў у Маскву і Ленінград. Аб інтэнсыўнасьці адгрузкі бульбы можна меркаваць па наступных лічбах.

На 25 кастрычніка было адгружана 1.300 вагонаў, а за адну толькі наступную пяцідзёўку—2.352 вагоны. Яшчэ выразнейшыя лічбы за апошнія дні. За 29 кастрычніка было адгружана 630 вагонаў, а 30—звыш 500.

Ня гледзячы на тое, што асеньні нарад на вываз бульбы выкананы, падвоз яе да станцый не паслабляецца. Узьнікла магчымасьць дадатковай адпраўкі 2 млн. пудоў бульбы за кошт асеньніх плянаў адгрузкі. Аб гэтым ужо паслалі запытаньне ў цэнтральныя арганізацыі Саюзу ССР.

Мясцовыя арганізацыі павінны дабіцца абавязковага выкананьня плянаў, даведзеных да кулацкага двара, у разьмерах, устаноўленых сельскімі сходамі.

Зараз ва ўвесь рост паўстае праблема захаваньня загатоўленае бульбы ад псаваньня. На мясцох на гэта павінна быць зьвернута сур'ёзная ўвага. Падшуканьне складаў, арганізацыя хаваньня бульбы ў ямах, рэгуляваньне падвозу бульбы да чыгуначных станцый, сваячасовы падвоз яе ў гарады БССР і на заводы па перапрацоўцы бульбы, часовае пакіданьне яе па хаваньні ў індывідуальных гаспадарках,—усё гэта дасьць нам магчымасьць унікнуць псаваньня бульбы.

Беларусь выканала свае абавязацельствы па забесьпячэньні бульбай пралетарскіх цэнтраў Саюзу. **Зараз трэба ўсю ўвагу перанесьці на ўзмацненьне загатовак ільну і датэрміновае выкананьне пляну хлебазагатовак.**

На 2 тыдні раней тэрміну

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Апошнія дні кастрычніка па Магілеўшчыне адзначыліся нябывалым посьпехам у галіне загатовак бульбы. Рад багатоўчых арганізацый выканалі пляны загатовак бульбы на 2 тыдні раней тэрміну. Няма ніводнага раёну, дзе-б у дзень ня было арганізавана па 2-3 чырвоныя абозы з бульбаю. За апошнія 3 дні ў Магілеў прибыла больш за 10 буйных чырвоных абозаў з бульбаю. Акрсельсаюз вызначанае яму заданьне па адгрузцы 300 вагонаў выканаў цалкам. Таксама Днепрасаюз ужо адгрузіў 300 вагонаў на 2 тыдні раней тэрміну.

Для хаваньня бульбы, якая пойдзе на забесьпячэньне патрэб рабочага насельніцтва акругі, Акрсельсаюз пачаў пабудову памяшканьня на 500 вагонаў у Шклове.

Гомельшчына адгрузіла 500.000 пудоў

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Гомельшчына на сёньняшні дзень ужо адгрузіла Маскве і Ленінграду 500 тысяч пудоў бульбы. Палессельсаюз і спажывецкая кааперацыя свае заданьні ўжо выканалі поўнасьцю. Рэчыцкі раён замест 56 вагонаў адгрузіў 60. Зараз ідзе нагрузка яшчэ 20 вагонаў. За тое Гомсадсаюз, Саюзхлеб і «Плодацэнтр» сваіх заданьняў цалкам ня выканалі. Трэба адзначыць, што кулакі ў некаторых мясцох аказваюць супраціўленьне загатоўкам бульбы. Зараз план загатовак даведзены да сяла і кулацкага двара.

Нявольніцтва ў Гон-Конгу

ГАНДАЛЬ НЯВОЛЬНІКАМІ АДБЫВА ЕЦЦА ПАД АПЕКАЮ «РАБОЧАГА» УРАДУ АНГЛІІ

ЛЁНДАН, 30. Як пэдае орган англійскай кампартыі «Уоркес Лайф», у Гон-Конгу ў сучасны момант налічваецца да 10 тысяч нявольнікаў, у большай частцы няпоўнагадовых, якія адкрыта купляюцца і прадаюцца на рынках. «Уоркес Лайф» зазначае, што міністар калёній «рабочага» ўраду ўжо тры месяцы таму назад абяцаў выступіць з заявай па пытаньні гандлю нявольнікамі ў Гон-Конгу, але да гэтага часу свайго абяцаньня ня выканаў.

Генэральская вайна ў Кітаі

ШАНХАЙ, 31. Паводле вестак агенцтва Рэйтэра, у Хэнані адбываецца форменная вайна. Войскі Гоміньцзюня (так званая першая народная армія Фынь Юй-сяна) вядуць ад Лунхая шырокае наступленьне на поўдзень. Урадавыя войскі адпраўлены ў прысьпешаным парадку в Пэйпіна ў Ханькоу і іншыя найбольш небясьпечныя пункты. Рашучыя дзеяньні разгортваюцца на граніцы. Прыезд Чан Кай-шы ў Ханькоў расцэньваецца, як аднака таго, што ўсе спробы мірна ўрэгуляваць канфлікт праваліліся.

Напярэдадні ўсеагульнай забастоўкі гарнякоў у Польшчы

ВЕРХНЯ-СІЛЕСКІЯ МЭТАЛІСТЫЯ ВЫСТУПАЮЦЬ РАЗАМ З ГАРНЯКАМІ

Пэпэсаўцы прадалі інтарэсы гарнякоў

ВАРШАВА, 31. У Варшаве, у міністэрстве працы ўчора адбылася нарада па пытаньні аб канфлікце ў каменнавугальнай прамысловасьці. **Пэпэсаўскія лідэры** прафсаюзаў, якія прымалі ўдзел у паседжаньні, **здалі бяз бою ўсе свае пазыцыі, згадзіўшыся на памяншэньне зарплаты ў разьмеры 5,6 проц. для вуглякопаў Дамброўскага і Кракаўскага каменнавугальных басэйнаў.**

Канфлікт паміж гарнякамі і прадпрыемцамі ў Верхня-Сілескім каменнавугальным басэйне нават не абгаворваўся на гэтай нарадзе. **Пэпэсаўцы гэтымі сваімі ўчынкамі нанесьлі здрадніцкі ўдар надыходзячай забастоўцы,** каб давесьці ўраду сваю поўную лёяльнасьць.

Баявы настрой сілескіх мэталістых

ВАРШАВА, 31. У Катовіцах (Верхняя Сілезія) адбыўся сход прадстаўнікоў мэталюргічных прадпрыемстваў, у якім прыняло ўдзел 126 рабочых дэлегатаў. Сход насіў бурны характар і сьведчыць аб баявым настроі рабочых мэталюргічных заводаў. Дэлегаты катэгарычна адхілілі арбітражнае рашэньне па пытаньні аб зарплаце і выказаліся за адначасовае выступленьне з гарнякамі 5-га лістапада. Паведамленьне аб тым, што арбітражная камісія пераглядзела сваю ранейшую пастанову, было спаткана з абурэньнем і гіроніяй. Баявая гатоўнасьць верхня-сілескіх мэталістых выступіць сумесна з гарнякамі Дамброўскага і Кракаўскага басэйнаў тлумачыць, чаму прадпрыемцы прынялі меры да зрыву забастоўкі гарнякоў. Бадай, што верхня-сілескія рабочыя выступяць супроць чарговага маноўру ППС. Паводле апошніх вестак, атрыманых в Катовіц, зьезд ФЗМК мэталёвых прадпрыемстваў прыняў пастанову абвясьціць дэманстрацыйную забастоўку 6-га лістапада.

Дырэктара фабрыкі--на тачцы за браму

ВАРШАВА, 31. Рабочыя буйнейшай мэталёвай фабрыкі «Лільпоп» вывезьлі на тачцы за браму фабрыкі галоўнага дырэктара Бранкоўскага. Ня гледзячы на тое, што на фабрыку зараз-жа прыбыла паліцыя, а таксама прадстаўнік міністэрства ўнутраных спраў, перагаворы паміж адміністрацыяй і рабочымі, якія зацягнуліся да позьняга вечару, не далі ніякіх вынікаў. На працягу ўчарашняга дня фабрыка «Лільпоп» не працавала.

Канфлікт у тэкстыльнай прамысловасьці

ВАРШАВА, 31. Прафсаюз тэкстыльшчыкаў перадаў саюзу прадпрыемцаў тэкстыльнай прамысловасьці рад новых патрабаваньняў аб павышэньні зарплаты, аб сацыяльным забесьпячэньні старых рабочых і аб аднаўленьні поўнага рабочага тыдню. Калі гэтыя патрабаваньні будуць адхілены, дык трэба чакаць, што ў тэкстыльнай прамысловасьці таксама выбухне канфлікт.

Адбылася рэпэтыцыя разгону сойму

ВАРШАВА, 31. Перакананўшыся ў немагчымасьці адкрыць паседжаньне сойму, а 8 гадз. Дашынскі перадаў у друкаванай форме ўсім дэпутатам сойму сваю заяву, у якой гаворыцца, што пад пагрозай шабель ён вымушан адтэрмінаваць паседжаньне сойму. Аб дні паседжэньня сойму дэпутаты будуць паведамлены асобна.

У палітычных колах падзеі, якія здарыліся, расцэньваюцца, як узброенае папярэджаньне сойму з боку пілсудчыкаў. Сёньня ўвесь сойм адчуў, што адбывалася рэпэтыцыя яго разгону.

Дзікае цкаваньне савецкіх карэспандэнтаў у Варшаве ня спыняецца

ВАРШАВА, 31. «Кур'ер Чэрвоны» ад цкаваньня карэспандэнта «Известий» перайшоў да цкаваньня абодых савецкіх карэспандэнтаў у Варшаве («Известий» і «ТАСС»). Сёньня «Кур'ёр Чэрвоны» выступае з новымі інсінуацыямі, накіраванымі супроць Браціна, прабуючы стварыць вакол Браціна атмасфэру шпіянажу. Газэта публікуе прозьвішча кватэрнай гаспадыні Браціна, пры чым уся заметка складзена ў такім духу, што ясна відаць жаданьне газэты дабіцца таго, каб кватэрная гаспадыня адмовіла Браціну ў кватэры.

«Кур'ёр Чэрвоны» ў сваёй кампаніі супроць палітычнага прадстаўніцтва і прадстаўнікоў савецкага друку, відавочна зьвязаны з адпаведнымі аўтарытэтнымі коламі. Гэта даводзіць той факт, што паводле распарадженьня старшыні сойму Дашынскага, Браціну ня выдалі карткі на права наведваньня сойму, хоць усім замежным карэспандэнтам, у тым ліку і карэспандэнту ТАСС такія карткі выданы. Такім чынам, Брацін пазбаўлен звычайных журналісцкіх прывілей. Гэты факт набывае асаблівае значэньне ў сувязі з тым, што Брацін зьяўляецца членам праўленьня клюбу замежных журналістых.

ЗА СПРОБУ ПАВЕСІЦЬ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ—АРЫШТ

ВАРШАВА, 30. Перад будынкам Варшаўскае турмы група рабочых прабавала павесіць на тэлеграфных правадох чырвоны сьцяг з лёзунгамі да гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Турэмны вартаўнік падняў трывогу. Адзін з рабочых арыштаваны.

Паніка на біржы Нью-Ёрку

НЬЮ-ЁРК, 30.—Нью-Ёркская біржа паранейшаму ахоплена панікай. **Каштоўнасьць акцый (паёў) буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў шпарка зьнижаецца.** Учора на працягу паўгадзіны спэкулянты збылі звыш 3-х мільёнаў акцый. Буйныя банкі, карыстаючыся зьніжэньнем цэн, узмоцнена скупляюць акцыі. Газэты паведамляюць аб банкруцтве адной спэкулянцкай фірмы.

***

Паніка на нью-ёркскай біржы і пасьпешнае зьніжэньне акцый адбіваюць нарастаньне затрудненьняў амэрыканскай прамысловасьці. За апошнія месяцы вытворчасьць вугальнай, стальной, будаўнічай, аўтамабільнай і іншых важных галін амэрыканскай прамысловасьці моцна скарацілася. Зусім магчыма, што амэрыканскі капіталізм зноў стаіць на парозе сур'ёзнага крызісу, які пагражаў яму яшчэ два гады таму назад і які быў тады адтэрмінаваны дзейнасьцю банкоў, якія далі прамысловасьці шырокі крэдыт на выгадных умовах.

На падставе гэтых крэдытаў, узмацнілася тады будаўніцтва ў гарадох і наогул павялічыліся заказы прамысловасьці. Цяжкасьці, зьвязаныя са збытам, такім чынам, былі ліквідаваны. Прыбыткі буйнейшых трэстаў хутка ўзрасьлі. Попыт на іх акцыі ўзмацніўся, і ў сувязі з гэтым пачала хутка ўзрастаць і цана акцый. У працягу кароткага часу цэны акцый падняліся настолькі, што яны перасталі ўжо адпавядаць нават, нячувана высокім прыбыткам трэстаў. Між тым, гэтыя прыбыткі ў сваю чаргу не адпавядалі сапраўднаму становішчу прадпрыемстваў, бо заказы, угрунтаваныя, галоўным чынам, на ільготных крэдытах, а не на ўзрастаючым попыце насельніцтва, толькі маглі часова адхіліць цяжкасьці збыту. Інакш, высокая цана акцый была ў два разы дутая. А пры гэтых умовах раней або позьней павінен быў наступіць момант іх шпаркага зьніжэньня.

Невычарпальныя крыніцы сырцу

Адкрытае ў Хібінскіх тундрах, на Кольскай паўвысьпе, месцанараджэньне апатыту павінна адыграць вельмі вялікую ролю ў разьвіцьці ў нас цэлага раду вытворчасьцяй і ўзьвяцьці ўраджайнасьці сельскае гаспадаркі.

Як вядома, хібінская парода, **запасы якой вылічаны ў 500 млн. тон,** вымяшчае ў сваім складзе, акрамя апатыту, таксама нэфэлін, тытана-магнэтыт, эгірын, сфэн і інш.

Усе гэтыя складаныя часткі пароды ў той, ці іншай меры могуць быць скарыстаны нашай прамысловасьцю, паніячываючы каштоўнасьць руды ў цэлым, бо сярэдні процант ва ўсёй яе масе чыстага апатыту складае каля паловы, 90 проц. другое паловы—нэфэлін.

Апатыт па сваім хэмічным складзе прадстаўляе фасфат кальцыя, г. зн. тойжа склад, як і вядомыя фасфарыты, якія ідуць на вытворчасьць супэр-фасфату, каторы найбольш распаўсюджаны ў сельскай гаспадарцы ў якасьці мінэральнага ўгнаеньня. Амаль усе нашы месцанараджэньні фасфарытаў вельмі нявысокай якасьці. Тыя-ж, каторыя па якасьці маюць прамысловае значэньне, як напрыклад, вяцкае і падольскае месцанараджэньні, вельмі невялікія і ня могуць на доўгі тэрмін забясьпечыць нашу супэрфасфатную прамысловасьць.

Ужываючы ягор'еўскія фасфарыты, бедныя фосфарам, мы павінны былі для атрыманьня штандартнага процанту ў супэрфасфаце фосфарнага ангідрыду ў 14 проц., дадаць або касьцяную муку, або замежны мараканскі фасфарыт, што, вразумела, значна падаражае атрыманы супэрфасфат.

Цяпер,—з выкрыцьцем апатытавых месцанараджэньняў, дадаткам да бедных фасфарытаў будзе служыць апатыт, бо на процанце ў ім фосфарнага ангідрыду, нават без абагачэньня, ён амаль ня ўступае, асабліва ў верхніх пластох месцанараджэньня мараканскаму фасфарыту **і стане ва ўсіх выпадках заменай апошняга.**

Высокі процант у апатыце фосфарнага ангідрыду, які пры жаданьні можна давесьці да 42 проц., у той час, як мараканскі фасфарыт ніколі не дае вышэй 36 проц., дазваляе ня толькі атрымаць супэрфасфат больш высокае якасьці, але і ўжываць яго ў іншых вытворчасьцях. Напрыклад, вопыты в ужываньнем апатыту для вырабу фосфару, які мае важнае значэньне для запалкавай прамысловасьці і мэталюргіі, гаспадараныя вопытным заводам ГІПХ'а, **далі дасканалыя вынікі.**

Такім чынам, у хібінскіх апатытах мы маем вялізныя запасы таго сырцу, які быў вельмі патрэбен нашай прамысловасьці.

Побач з апатытам, як ужо было сказана, у адкрытым месцанараджэньні ёсьць яшчэ рад іншых мінэралаў, з якіх асабліва ўвагі заслугоўвае нэфэлін, а таксама тытана-магнэтыт.

Апошні дае сырэц для атрыманьня тытанавых бяліл, якія атрымалі ўжо заграніцай усе правы грамадзянства, як лепшая белая фарба, каторая замяняе шкодныя сьвінцовыя бяліны, выраб якіх прызнана і ў нас, у Саюзе, спыніць у 1930 годзе.

Калі прыняць процант тытана-магнэтыту ў пародзе нават у 5 проц., дык і тады, пры абагачальных працэсах (флётацыі), мы будзем мець ад 500 млн. усёй пароды, забесьпячэньне гэтым сырцом для новае фарбавае вытворчасьці на ўсю нашу патрэбнасьць у ім на некалькі сот год.

Што-ж датычыць нэфэліну, дык в гэтым мінэралам зьвязаны няменшыя падзеі ня толькі шкляной, але і ўсёй хэмічнай прамысловасьці Справа ў тым, што па сваім складзе ён прадстаўляе сілікат алюмінія і шчолачных мэталяў, г. зн. **амаль гатовую шыхту для шкла.**

Пры плаўцы нэфэлін амаль бяз усякіх дадаткаў дае дасканалае шкло для бутэляк, якое па трываласьці і якасьці перавышае атрыманае з звычайных матар'ялаў: соды, сульфату, пяску і крэйды, але ў некалькі раз таней апошняга, аслабляючы адначасова для іншых мэт значную колькасьць соды і сульфату.

Склад нэфэліну вельмі напамінае ў некаторых адносінах вядомую сінюю фарбу, ультрамарын, што дало магчымасьць скарыстаць гэты мінэрал для атрыманьня апошняга. **Вопыты зусім апраўдалі гэта меркаваньне** і дазволяць зьнізіць сабекошт гэтай фарбы па 30 проц., аслабяніўшы значную колькасьць дэфіцытнай соды, інфузорнай зямлі і кааліну, якія зараз ідуць на ўльтрамарынавую вытворчасьць.

У апошні момант пастаўлены цікавыя вопыты па атрыманьні з нэфэліну окісі алюмінія для вырабу мэталёвага алюмінія і сілікогэля, што ў выпадку ўдачы абяцае, з аднаго боку, у няхымерный ступені павялічыць нашу сырцовую баксітную базу, якая. як вядома, забясьпечвае нас усяго толькі на дзесятак год, з другога-ж боку, дасць сілікогэль,—прадукт, які атрымлівае ўсё большае і свяасаблівае ўжываньне ва ўсіх галінах прамысловасьці для ўлаўліваньня газаў, каталітычных рэакцый і г. д.

Той-жа нэфэлін ужо зараз ідзе, як замена палявога шпату ў фарфара фаянсавай вытворчасьці, даючы магчымасьць павялічыць наш экспарт.

Маючы ў сваім складзе калій, нэфэлін можа атрымаць ужываньне, як калійнае ўгнаеньне ў сельскай гаспадарцы, што пацьверджана ўжо вопытамі калёнізацыйнага аддзелу Мурманскай чыгункі.

Усё гэтыя даныя гавораць за тое, што ў адкрытым апатыта-нэфэлінавым месцанараджэньні крыюцца вялізныя крыніцы сырцу для вытворчасьці надзвычай важных для ўсяе народнае гаспадаркі краю прадуктаў і **трэба палажыць усе намаганьні да таго, каб даць магчымасьць краю хуткім чынам пачаць іх скарыстаньне.**

Інж. В. Н. ІВАНОЎ

АШУКАНЫЯ НАДЗЕІ НЯМЕЧЧЫНЫ

БЭРЛІН, 25. У друку пачынаюць зьяўляцца некаторыя падрабязнасьці аб зьмесьце мэмарандуму, які дырэктар нямецкага дзяржаўнага банку Шахт перадаў гэтымі днямі прадстаўніком дзяржаўных крэдытараў на нарадзе ў Бадэн-Бадэне, дзе выпрацоўваюцца пытаньні арганізацыі рэпарацыйнага банку. Цэнтральным пунктам гэтага мэмарандуму зьяўляецца патрабаваньне аб тым, каб новы банк узяў на сябе правядзеньне ўсіх мер, зьвязаных з ажыцьцяўленьнем пляну Юнга. Ход перагавораў у Бадэн-Бадэне выклікаў, відавочна, у Нямеччыне сур'ёзны непакой, што праект статуту банку,я кі там выпрацоўваецца, будзе ў многім адрозьнівацца ад плянаў, якія зьвязваліся ў часе парыскіх перагавораў са стварэньнем банку. Гэта адносіцца асабліва да таго параграфу пляну Юнга, у якім гаворыцца аб адкрыцьці новых рынкаў збыту і аб узмацненьні нямецкага вывазу.

Якраз разьлік на пашырэньне замежнага гандлю Нямеччыны і сыграў галоўную ролю ва ўступлівай пазыцыі нямецкіх экспэртаў. Між іншым, ужо тады ў нямецкай эканамічнай прэсе былі папярэджаньні аб тым, што ня трэба аддаваць надта вялікім ілюзіям у гэтым напрамку. Ход перагавораў у Бадэн-Бадэне, які відаць, сьцьвярджае гэты непакой. Наўрад ці зьявілася-б патрэба ў мэмарандуме Шахта, калі-б нямецкія дэлегаты ў Бадэн-Бадэне не наткнуліся на сур'ёзную ўпорлівасьць крэдытараў у пытаньні аб наданьні рэпарацыйнаму банку шырокіх гаспадарча-фінансавых функцый. Да гэтага варта дадаць, што адна з функцый банку, прадбачаная планам Юнга, а іменна мажлівасьць абярнуць яго ў фінансавы трэст, зьявілася нязьдзейсьняльнай. У пляне Юнга прадбачвалася наданьне новаму банку магчымасьці выпускаць уласныя абавязацельствы, гарантаванымі нямецкімі плацяжамі і прадаваць іх за межы з мэтай разьмеркаваньня атрыманых сум паміж крэдытарамі. Такім шляхам можна было-б зрабіць больш гібкім выкананьне рэпарацыйных абавязацельстваў і тым палегчыць вырашэньне праблемы трансфэру. Прынятая ў Бадэн-Бадэне пастанова не дазваляць банку выпуск гэткіх аблігацый, анулюе гэтую магчымасьць. Між іншым, і ў самой Нямеччыне чутны галасы супроць мэтазгоднасьці наданьня банку праў фінансавага трэсту, бо такім чынам быўбы легалізаваны «нерэальны» трансфэр. Ва ўсякім выпадку, ужо цяпер у Бадэн-Бадэне адступаюць ад раду выгадных для Нямеччыны пастаноў па пляне Юнга.

Перагаворы пры ўсёй марудласьці ўсё-ж падыходзяць да таго моманту, калі прыдзецца прыняць пастановы па найбольш буйных пытаньнях, вакол якіх ідзе барацьба. У прыватнасьці, чакаюць пастановы аб месцазнаходжаньні банку, і магчыма, што будзе дасягнуты «кампраміс» адносна разьмеркаваньня яго функцый на некалькі філіялаў. Кажуць, што перагаворы вельмі зацягнуцца, і такім чынам, затрымаюць канчатковае вырашэньне па ўсіх пытаньнях, якія зьвязаны з правядзеньнем у жыцьцё пляну Юнга.

(Известия).

За 7-мі гадзінны рабочы дзень, за павялічэньне зарплаты

ЗАКЛІК АНГЕЛЬСКАЙ КАМПАРТЫІ ГАРНЯКОЎ ДА БАРАЦЬБЫ

ЛЁНДАН, 31. Ангельская камуністычная партыя апублікавала адозву, прысьвечаную пытаньню аб становішчы ў вугальнай прамысловасьці. Кампартыя засьцерагае рабочых, каб яны не ашукваліся сябе цяперашнімі перагаворамі паміж агульна-ангельскай фэдэрацыяй горнарабочых і ўрадам. Кампартыя заклікае горнарабочых сарваць плян ураду і рэакцыйных чыноўнікаў з фэдэрацыі шляхам арганізацыі «камітэту дзеяньня» на кожнай капальні. Гэтыя камітэты павінны ўзяць на сябе кіраўніцтва як арганізаванымі, так і неарганізаванымі рабочымі ў іх барацьбе за лепшыя ўмовы працы.

Адозва падкрэсьлівае значэньне мясцовых забастовак у Паўднёвым Уэльсе, Шатлянды і іншых мясцох і паказвае, што кампартыя будзе ўсебакова падтрымліваць мясцовыя забастоўкі, разьвіваючы іх ва ўсіх напрамках і абгрочваючы іх у агульную барацьбу гарнякоў супроць капальняўласьнікаў і ўраду рабочай партыі. Ажыцьцяўленьне праў ураду ўзмоцніць зло, якое існуе ўнутры краю, абвострыць міжнародную канкурэнцыю і прывядзе да далейшага пагоршаньня становішча ангельскіх горнарабочых. Для таго, каб забясьпечыць агульна-ангельскую сетку зарплаты і 7-гадзінны рабочы дзень у капальнях, гарнякі павінны быць гатовы да барацьбы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Адозва вымяшчае наступныя лёзунгі: «За арганізацыю камітэтаў дзеяньня», «За 7-гадзінны рабочы дзень і за павялічэньне заработнай платы», «Прэч рэакцыйнае кіраўніцтва прафсаюзаў», «Проч урад рабочай партыі».

Тардзье фармуе ўрад

ПАРЫЖ, 31. Клемантэль заявіў, што адмаўляецца ад складаньня новага ўраду. Атрымаўшы адмову ад Клемантэля, прэзыдэнт Думерг заклікаў да сябе Тардзье і даручыў яму сфармаваць новы габінэт. Тардзье ўжо меў нараду в Брыянам.

Тардзье займаў пост міністра ўнутраных спраў у апошнім габінэце Брыяна і ў папярэднім габінэце Пуанкарэ. Ён кіраваў сыстематычным і жорсткім прыдушэньнем рэвалюцыйнага рабочага руху.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

Вялізарная дэманстрацыя беспрацоўных у Данцыгу

БЭРЛІН, 31. Як паведамляюць з Данцігу, там учора, ня гледзячы на забарону паліцыі, перад будынкам парляманту адбылася вялізная дэманстрацыя беспрацоўных. Паліцыя, прабуючы разагнаць дэманстрантаў, ня раз пускала ў ход гумовыя палкі. Старшыня Данцынгскага парляманту з прычыны дэманстрацыі прымушаны быў два разы перарваць пасяджэньне парляманту. Камдэпутат парляманту Клянікоўскі на паседжаньні парляманту заявіў пратэст супроць забароны дэманстрацыі і паводзін паліцыі. У адказ на пратэст парлямант выключыў яго на 8 паседжаньняў. Клянікоўскі адмовіўся пакінуць залю паседжаньняў і быў выведзен адтуль пры дапамозе паліцыі.

Павялічэньне беспрацоўя ў Мэксыцы

НЬЮ-ЁРК, 31. У найбольш багатых с.-г. штатах Мэксыкі—Коагуйла і Дэюрандзе наглядаецца вялізнае павялічэньне беспрацоўя і беднасьці сярод насельніцтва ў зьвязку з неўраджаем хлябоў. (ТАСС).

Француская кампартыя ачышчае свае рады

ПАРЫЖ, 31. Лопарт і Лоя, якія выключаны з партыі за ўдзел разам з сацыялістымі ў паездцы ў фашысцкую Вэнгрыю на мітынгу, скліканым кампартыяй у Сэн-Дэні (прадмесьце Парыжа), прабавалі апраўдацца, але былі асьвістаны рабочымі. Ва ўхаленай аднагалосна рэзалюцыі гаворыцца:

«Рабочыя Сэн-Дэні, заслухаўшы тлумачэньне аб выключэньні з кампартыі недысцыплінаваных муніцыпальных радных—камуністых, выказваюць поўную салідарнасьць з кампартыяй, ганьбяць нявытрыманасьць выключаных, патрабуюць ад іх неадкладнай здачы муніцыпальных мандатаў, атрыманых ад рабочых выбарчыкаў, абязуюцца весьці барацьбу за кампартыю, «Юманітэ», за вызваленьне паліт-зьняволеных, за абарону пераможнай Кастрычніцкай рэвалюцыі».

Мітынг прайшоў з выключным уздымам.

Пахаваньне камсамольца Леві абярнулася ў магутную дэманстрацыю супроць фашысцкага тэрору

ВЕНА, 30. Паводле вестак з Будапэшту, чырвонае пахаваньне памёршага ў турме ад галадоўкі камсамольца Леві абярнулася ў дэманстрацыю рэвалюцыйных рабочых супроць фашысцкага тэрору, за здавальненьне патрабаваньняў палітычных зьняволеных і за ўсеагульную палітычную амністыю. Паліцыя арыштавала 28 дэманстрантаў.

2 ГАДЫ КАТАРГІ ЗА НАДРУКАВАНЬНЕ ПЕРШАЖНІВЕНЬСКАЙ АДОЗВЫ

ПАРЫЖ, 31. Загадчык друкарні ўніТарнай канфэдэрацыі працы Лемарра прыгавораны да 2-х год турэмнага зьняволеньня і да штрафу ў 3.000 франкаў за надрукаваньне перша-жнівеньскай адозвы.

Скарачэньне аўтамабільнай прамысловасьці ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК, 31. Як падаюць з Дэтройта (цэнтр аўтамабільнай прамысловасьці ПАЗШ), наглядаецца рэзкае скарачэньне вытворчасьці ў аўтамабільнай прамысловасьці. **На прадпрыемствах Форда за апошнія тыдні звольнена 30.000 рабочых.** (ТАСС).

Рабочыя сабралі на карысьць „Юманітэ“ 700.000 франкаў

ПАРЫЖ, 31. «Юманіта» ў адозьве да чытаўлоў адначае вельмі добрыя вынікі кампаніі на карысьць «Юманітэ», якая дала больш 700.000 франкаў за 2 месяцы (з моманту спробы разгрому рабоча-сялянскага банку). Вітаючы ставрэньне паўсямесна па прадпрыемствах камітэту абароны «Юманітэ» ў адозьве, заклікае да яшчэ большага ўзмацненьня гэтай кампаніі, да працягваньня збору сродкаў і да далейшага пазьдзічэньня тыражу газэты, які дасягнуў ужо 200.000 экз.

Новыя рэпрэсіі супроць бастуючых гарнякоў у Чэха-Славакіі

АДЗІНЫ ФРОНТ РЭФАРМІСТЫХ З ПРАДПРЫЕМЦАМІ І ЎЛАДАЮ

ПРАГА, 31. Забастоўка гарнякоў у раёне Бруха за апошнія дні праходзіць у вельмі цяжкіх умовах, з прычыны супольнага націску рэфармістых, прадпрыемцаў і ўлады. Паведамляюць аб новых арыштах. Зараз-жа пасьля роспуску забастовачнага камітэту ў Бруху улада выдала дадатковае распараджэньне, якое пагражае рэпрэсіямі ў выпадку выкананьня рабочымі інструкцый забастовачнага камітэту.

Орган кампартыі «Рудэ Право» заклікае рабочых да пратэсту супроць апошніх распараджэньняў улады, якія фактычна ліквідуюць права забастоўкі. Рабочыя Бруху абураны паводзінамі некаторых камуністых, членаў фабзаўкомаў, якія сваімі дзеяньнямі фактычна дапамагалі рэфармістым, зрываць забастоўку. Рабочыя патрабуюць выключэньня гэтых камуністых з партыі і прафсаюзу. У сувязі з гэтым кампартыя ўжо некаторых выключыла.

У суседнім з Бруху раёне Дукс адбылася канфэрэнцыя гарнякоў, якія выказаліся за салідарнасьць з бастуючымі і за падрыхтоўку забастоўкі ў сваім раёне.

У МУКДЭНСКІХ ЗАСЬЦЕНКАХ

Новая ўсеагульная галадоўка ў Сумбэйскім лягеры

ТОКІЁ, 30. Як паведамляюць з Харбіна, 28-га а 6 гадз. вечара ў Сумбэйскім лягеры была абвешчана новая ўсеагульная галадоўка з прычыны захворваньня на глебе халадоў.

Паводле неспраўджаных вестак, кітайскія ўлады забаранілі нямецкаму консулу раздачу дапамогі савецкім грамадзянам. (ТАСС).

Новыя арышты савецкіх грамадзян

ТОКІЁ, 30. З Харбіна паведамляюць пра новыя арышты савецкіх грамадзян, пры чым двое моцна зьбіты ў часе арышту. (ТАСС).

100 чалавек хворых у Сумбэйскім лягэры

ТОКІЁ, 31. У Сумбэйскім лягеры каля 100 чалавек хворых фурункулёзам. Пытаньне аб галадоўцы ня высьветлена. Адміністрацыя не дае магчымасьці праверыць, ці адбываецца галадоўка, запэўніваючы, што ніякай галадоўкі няма.

Наглыя патрабаваньні кітайскай ваеншчыны

ТОКІЁ, 31. Як паведамляюць з Харбіна, нанкінскія ўлады звярнуліся да нямецкага консула Штобэ з патрабаваньнем звольніць усіх савецкіх супрацоўнікаў, прыкамандыраваных нямецкаму консульству для выдачы даведак. Консул адмовіўся выканаць гэтае патрабаваньне, заявіўшы, што нямецкія супрацоўнікі консульства, з прычыны вялікага наплыву савецкіх грамадзян, ня спраўляцца з работай.

Улады патрабавалі тады, каб быў дапушчаны паліцэйскі кантроль над работай паказаных супрацоўнікаў, а таксама кантроль над выдачай пэнсіі савецкім грамадзянам з правам умяшацца ў справы па сутнасьці, аддаваць распараджэньне. Консул адмовіўся выканаць гэтае патрабаваньне, у сувязі з гэтым выдача пэнсій часова спынена.

Напружанае становішча ў Харбіне

ПЭЙПІН, 31. У Пэйпіне ўведзена самая строгая цэнзура лістоў, тэлеграм і тэлефонных перагавораў. (ТАСС).

ТОКІЁ, 31. Становішча ў Харбіне вельмі напружанае. Рэпрэсіі ня спыняюцца. У выніку апошніх арыштаў амаль зусім разгромлены рэшткі рабочых арганізацый. Прызнаньне да віны, якое паводле вестак газэт, нібы, зроблена арыштаванымі, зьяўляецца вынікам нячуваных катаваньняў у ахранцы. (ТАСС).

ПЭЙПІН, 31. З арыштаваных у Пэйпіне рыкш, вызвалены толькі 38 рыкш, 144 знаходзяцца ў зьняволеньні.

ДЫМАВАЯ ЗАСЛОНА НАНКІНА

ШАНХАЙ, 29. Усе апошнія паведамленьні, якія выходзяць з кітайскіх крыніц Нанкіна і Мукдэна, а таксама і ад чужаземных інфарматараў, што абслугоўваюць Нанкін, падаюць выразна **інсьпіраваную думку** аб тым, што паміж Кітаем і СССР стварылася безнадзейнае

Партыйнае будаўніцтва

ФРАКЦЫЙНАЯ РАБОТА БУХАРЫНСКАЙ ПРАВАЙ АПАЗЫЦЫІ

КП(б)Б, як і УсеКП(б), дасьць бальшавіцкі, бязьлітасны адпор фракцыйным вылазкам правых апазыцыянэраў і іх лідэраў

Факты, якія зьявіліся ў апошні час, ъьведчаць аб тым, што бухарынская апазыцыя ня толькі зьмяшчае ў сабе элемэнты фракцыйнасьці, але і **вядзе фракцыйную работу. Яе фракцыйны твар становіцца ўсё больш і больш відавочным.**

Нядаўняе выступленьне на сходзе ячэйкі партыі і камсамолу тормазнага заводу Мацьвеева з абаронай правых поглядаў, фракцыйная вылазка А. Сьляпкова ў Самары з нападкамі на ЦК і ЦО партыі, заводзіны прадстаўнікоў Бухарынскай школы Цэйтліна і Марэцкага ў часе чысткі партыі паказваюць, чаго варты заявы лідэраў апазыцыі і іх прыхільнікаў аб тым, што апазыцыі яны ня створаць і фракцыйнай работы весьці ня будуць.

Факты апазыцыйнай дзейнасьці правых зазначаюць, што яны сталі на шлях барацьбы супроць партыі, супроць яе ленінскага бальшавіцкага Партыя дае бязьлітасны бальшавіцкі адпор фракцыйным вылазкам правых.

У Маскве і Ленінградзе адбыліся сходы буйнейшых парт'ячэек, на якіх абгаворвалася пытаньне аб унутрыпартыйным становішчы ў зьвязку з апошнімі фракцыйнымі выступленьнямі правых.

Сходы ячэк канстатуюць, што права-апартуністычныя элемэнты ў нашай партыі працягваюць упарта настойваць на сваіх памылках, скочваючыся на шлях фракцыйнай барацьбы.

Ячэйкі патрабуюць прыняць самыя рашучыя арганізацыйныя меры ў адносінах да апазыцыянэраў, якія вядуць фракцыйную работу.

— Правая апазыцыя тармозіць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. У пэрыяд напружаных тэмпаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва, у пэрыяд разгортваньня клясавых боек у краіне і перажытых у сувязі з гэтым няўхільных труднасьцяй, мы лічым недапушчальнымі дзэарганізатарскія фракцыйныя вылазкі правых на чале з тав. Бухарыным і патрабуем ад свайго ленінскага ЦК **прыняцьця рашучых мер на аснове пастаноў красавіцкага пленуму ЦК,**— такую пастанову прынялі камунары заводу «Динамо».

Сход партыйнага актыву **Бальтыцкага** заводу ў Ленінградзе «з асаблівым абурэньнем адзначае факты, пераходу права-ўхілістых да адкрытых фракцыйных дзеяньняў і патрабуе ад ЦК партыі **даць па руках фракцыянэрам,** што зарваліся. Актыў балтыйцаў запэўняе надыходзячы пленум ЦК партыі ў тым, што ў асяродзішчы паўтарытысячнай масы камупараў-бальтыйцаў няма і ня будзе падтрыманьня правым апартуністым».

Сход ячэйкі фабрыкі імя **Маркава** абгаворваючы пытаньне аб 5-цігадовым пляне фабрыкі, заяўляе, што рабочая кляса поўнасьцю ажыцьцёвіць плян вялікіх работ ва ўсёй краіне і на кожным прадпрыемстве пры ўмове рашучага і спачасовага перамаганьня права-апартуністычнай ідэалёгіі, якая разбройвае волю рабочае клясы да ажыцьцяўленьня пяцігодкі. Сход патрабуе прыняцьця рашучых мер для **спыненьня ўсякай фракцыйнай барацьбы супроць партыі і Камінтэрну.**

Адначасова партыйныя ячэйкі «рашуча асуджаюць тэарэтыкаў «левай» фразы, якія скочваюцца па пазыцыі разьбіта партыяй трацкізму» (партактыў Балтзаводу).

Бальшавікі даюць ъьвёрды адпор усім тым, хто прабуе падарваць жалезную дысцыпліну бальшавіцкай партыі, хто тармозіць нашае пасьпяховае сацыялістычнае наступленьне, хто, спэкулюючы на труднасьцях рэканструкцыйнага пэрыяду, хоча цягнуць партыю назад.

Усе арганізацыі нашай партыі ва многа раз павінны ўзмацніць сваю пільнасьць да праяў правага апартунізму, непадпарадкаваньня волі і дысцыпліне нашай партыі.

Партыя і надыходзячы пленум яе ЦК павінны зрабіць усе патрэбныя захады для спыненьня фракцыйнай, дэзарганізатарскай дзейнасьці Бухарынскай правай апазыцыі і яе лідэраў.

Ячэйкі КП(б)Б павінны мабілізаваць сваю ўвагу да апошніх дэзарганізатарскіх выступленьняў правых фракцыянэраў.

КП(б)Б пабальшавіцку ацэніць гэтыя вылазкі.

Арганізацыі КП(б)Б дадуць патрэбныя бязьлітасны адпор усякім спробам падарваць жалезнае адзінства ленінскіх радоў нашай партыі.

Актыўней павядзем барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам

Ачысьцім партыю ад нацыянал-дэмакратычных агентаў

дамо адпор прымірэнчым адносінам да нацыянал-дэмакратызму

Апошняя вылазка нацыянал-дэмакратаў у часе чысткі ячэйкі НКА атрымала наш рашучы адпор. Але было-б няправільна думаць, што на гэтым адпоры канчаецца або павінна паслабнуць барацьба супроць нацыянал-дэмакратызму і яго канкрэтных посьбітаў.

Партыя не ачышчана яшчэ ад усяго нацыянал-дэмакратычнага сьмяцьця палітычнае выкрыцьцё контр-рэвалюцыйнай сутнасьці нацыянал-дэмакратызму ня можа абмежавацца толькі эпізадычнымі выступленьнямі.

Апошнія паскокі нацыянал-дэмакратаў на лінію партыі жорстка і аднадушна асуджаюцца партыйнай арганізацыяй.

Усе ячэйкі, усе раённыя і акруговыя камітэты павінны хутка і чула рэагаваць на кожную спробу рэвізіі ленінскай лініі партыі, кім-бы яна не рабілася і з якога-б боку яна не праводзілася. Маруднасьць і палітычная пасыўнасьць у гэтай справе надзвычайна шкодны і небясьпечны. Барацьба з усімі відамі нацыянал-дэмакратызму, асабліва з беларускім, як найбольш небясьпечным у сучасны пэрыяд, гэта не ападзенная кампанія, гэта сур'ёзная і доўгая барацьба з нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіяй, гэта выяўленьне і выкрыцьцё перад партыяй усіх прадстаўнікоў гэтай ідэолёгіі, гэта, нарэшце, ачышчэньне партыі ад застаўшыхся яшчэ ў ёй нацыянал-дэмакратаў. Тым больш важна, асабліва, у моманты завастрэньня гэтай барацьбы, як гэта мы бачым зараз у выніку групавой вылазкі нацыянал-дэмакратаў, хуткае рэагаваньне арганізацыямі нашай партыі, актыўнасьць і кіраўніцтва гэтай барацьбой.

Актыўней павядзем барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам! Выкрыем перад шырокімі партыйнымі масамі яго контр-рэвалюцыйную сутнасьць! Завострым палітычную чуласьць арганізацый! Правядзем шырокую работу ў партыйных нізох па поўным усьведамленьні нашай партыйнай лініі і ў прыватнасьці, нашай нацыянальнай палітыкі.

Выступленьні Ільючонка, Марука і Івана Цьвікевіча былі правільна кваліфікаваны, як нацыянал-дэмакратычныя выступленьні, несумяшчальныя з прабаваньнем у радох нашай партыі. Зразумела, зусім няправільна характарызаваць гэтыя выступленьні толькі, як прымірэнцтва да нацыянал-дэмакратызму. Іх выступленьні былі адкрыта нацыянал-дэмакратычныя. Канцэпцыі іх поглядаў у суме сваёй складаюць махровы нацыянал-дэмакратызм. Пачынаючы ад адмаўленьня кіруючай ролі кампартыі ў стварэньні БССР і канчаючы злоснымі антыпартыйнымі выпадамі супроць кіраўніцтва і чысткі партыі, гэтыя людзі зьяўляюцца тыповымі, завяршонымі прадстаўнікамі нацыянал-дэмакратычнай агентуры ў радох нашай партыі. **Ачысьціць партыю ад гэтай агентуры, выкінуць вон асобных людзей, якія салідарызуюцца з падобнымі выступленьнямі, г. зн. вызваліць нас ад элемэнтаў, якія актыўна супраціўляюцца ажыцьцяўленьню правільнай лініі сацыялістычнага будаўніцтва,** правільнага курсу на ўзмацненьне і будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры, цьвёрдай устаноўкі на беларусізацыю і адначасова— рашучай барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам усіх відаў і колераў.

Вядучы рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам, наша партыя дае рашучы адпор і **прымірэнчым адносінам** да нацыянал-дэмакратызму. У чым выяўляюцца і могуць выявіцца такія прымірэнчыя адносіны? Яны выяўляюцца ў асобных галасох супроць «вельмі вострай барацьбы». Яны выяўляюцца ў гутарках на тэму аб тым, што «для чаго, моў, спрачацца, для чаго падымаць такі шум, для чаго завастраць адносіны». Дзе-нідзе яны выяўляюцца ў фармальным прызнаньні правільнасьці лініі партыі і, калі хочаце, нават у «прызнаньні» памылак таго або іншага таварыша, але адначасова ва ўзмоцненым усхваленьні яго асабістых паслуг, маючы мэтай **паслабіць увагу на палітычных памылках, згладзіць вострасьць палітычнай крытыкі і г. д., і г. д.**

Прымірэнец да нацыянал-дэмакратызму перашкаджае барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам, паслабляе гэтую барацьбу і па сутнасьці скочваецца па пазыцыі нацыянал-дэмакратызму. Усе гэтыя рысы прымірэнцтва да нацыянал-дэмакратызму характарны і для прымірэнцтва да ўхілаў ад ленінскай лініі партыі наогук. Яшчэ лістападаўскі пленум ЦК КП(б)Б у мінулым годзе правільна адзначаў, што: «Трэба і ўпутры партыі рашуча змагацца з усялякімі ўхіламі ад бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі, **якія заўсёды непарыўна зьвязаны з агульнымі ўхіламі ад лініі партыі»** (падкрэсьлена намі. **Рэд.**). **Паскрабеце партыйца з нацыянал-дэмакратычным ухілам і вы ў ім абавязкова знойдзеце ўхілістага па пытаньнях агульна-партыйнай лініі.** Таму і ў характары прымірэнцтва мы бачым агульныя рысы. Таму будзе правільна, калі мы скажам, што сёнешні прымірэнец да нацыянал-дэмакратызму заўтра можа стаць нацыянал-дэмакратычным ухілістым, можа перайсьці на пазыцыю адкрытай абароны нацыянал-дэмакратычных поглядаў.

Выкрыем прымірэнчыя адносіны да нацыянал-дэмакратызму! Павядзем з прымірэнцтвам рашучую барацьбу. Моўчкі адрабляцца нельга, «алілюйнічаньнем»—таксама. Патрэбна палітычная, ясная і рашучая барацьба з нацыянал-дэмакратызмам, бяз усякіх агаворак, бяз усякага маўклівага абыходу «вострых» пытаньняў.

Наша партыя са зброяй бальшавіцкай непрымірымасьці пад кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту вяла і будзе весьці рашучую барацьбу супроць усякіх ухілаў ад лініі партыі, супроць нацыянал-дэмакратызму і прымірэнчых да яго адносін, за ачышчэньне партыі ад агентаў нацыянал-дэмакратызму.

У балоце сямейнасьці і кругавой парукі

Зацісканьне самакрытыкі.--Прымірэнцтва да ухілаў ад лініі партыі.--Беспрынцыповае дзяляцтва замест палітычнай работы

Глушыцелі самакрытыкі і антысэміты павінны быць выкінуты з партыі

Пачалася праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б Белдзяржстраху. Праверачная камісія прыдзецца дасканала і ўважліва праверыць усю работу гэтай ячэйкі і яе членаў і кандыдатаў, каб канчаткова выкарчаваць карэньні тых агідных, абураючых зьяў, якія тварыліся ў ячэйцы.

Сапраўды, мінулае ячэйкі—гэта сумная гісторыя нячуваных фактаў зацісканьня самакрытыкі, цкаваньня асобных працаўнікоў, склочніцтва, антысэмітызму, скажэньняў правільнай партыйнай лініі і г. д.

Фрунзаўскі раённы камітэт партыі своячасова рэагаваў на гэтыя факты і правёў абсьледваньне ячэйкі. Бюро парт'ячэйкі за нерэагаваньне на факты зацісканьня, склочніцтва, антысэмітызму і нерашучасьць і бязьдзейнасьць у барацьбе з права-апартуністычнымі і і прымірэнчымі хістаньнямі асобных членаў ячэйкі—было распушчана.

Здаецца, што новае бюро павінна было павесьці рашучую барацьбу з хваравітымі зьявамі і прыняць канкрэтныя мерапрыемствы па аздараўленьні ячэйкі.

Але ў сапраўднасьці **бюро літаральна нічога не зрабіла, каб зьнішчыць ганебную спадчыну мінулага і разгарнуць належную партыйна-палітычную работу.** Ячэйка замкнулася ў сваёй работе і ізалявалася ад беспартыйных супрацоўнікаў.

Сярод членаў ячэйкі існуе кругавая парука, пры дапамозе якое старанна замазваліся ўсе недахопы і скажэньні.

Замест таго, каб аздаровіць работу апарату і мясцкому, ячэйка ў радзе выпадкаў выступала супроць правільных пастаноў ЦП саюзу і калектыву супрацоўнікаў.

Так, напрыклад, парт'ячэйка адзіным фронтам выступіла супроць правільнай пастановы ЦП саюзу і сходу калектыву аб роспуску мясцкому Белдзяржстраху. Тлумачыцца гэта тым, што некаторыя члены бюро ячэйкі (**Сандлер, Боранаў, Чарняўскі**) кіравалі работай мясцкому, які груба парушаў прафэсыянальную дэмакратыю, заціскаў самакрытыку, не змагаўся з антысэмітызмам і г. д.

Самакрытыка ва ўстанове не разгорнута. Трыкутнік—ячэйка, адміністрацыя, мясцком—ня толькі ня спрыялі разгортваньню самакрытыкі, а наадварот, самі заціскалі самакрытыку і крытыку. Старшыню мясцкому партыйку **Бакман,** чужы для партыі элемэнт, якая давяла мясцком да поўнага развалу, ячэйка ня толькі ня выключыла з партыі, а наадварот, дала ёй магчымасьць на казённыя грошы выехаць з Менску.

Глушыцеля самакрытыкі **Воранава** зноў уводзяць у склад бюро парт'ячэйкі, **Чарняўскі і Сандлер,** якія скампрамэтавалі сябе на рабоце ў мясцкоме, таксама застаюцца ў бюро ячэйкі.

Куніцкага, антысэміта і п'яніцу, які заціскаў самакрытыку, выбіраюць сакратаром камсамольскай ячэйкі. Вось якім чынам ячэйка аздараўляла сваю работу, пакідаючы на адказнай рабоце глушыцеляў самакрытыкі, якія скампрамэтавалі сябе роднымі агіднымі ўчынкамі і антыпартыйнымі паводзінамі. Кіраваць рэдкалегіяй вылучылі Русовіча, які замазваў усе прарывы і скажэньні ў практыцы ячэйкі і ўстановы і абураючыя паводзіны асобных членаў партыі.

Нельга не адзначыць поўную бязьдзейнасьць і нерэагаваньне ячэйкі на ўсе гэтыя факты.

Ня гледзячы на тое, што члены рэдкалегіі і супрацоўнікі былі настроены супроць **Русовіча,** які, як высьветлілася, быў ня толькі глушыцелем самакрытыкі, але і антысэмітам, Русовіч быў зноў пакінуты на рабоце ў рэдкалегіі. Праўда, зараз Русовіч з работы зьняты, але новае партбюро вылучыла старшынёй рэдкалегіі **Ермакова,** які таксама глушыць самакрытыку і замазвае хваравітыя зьявішчы.

Аб шкодных зьявах і блізарукасьці памылкі партбюро казаць ня трэба.

Унутры ячэйкі панавала зацісканьне. Сумленных партыйцаў, якія выступалі з крытыкай і выкрывалі недахопы і скажэньні, цкавалі. Тав. Філэра, які заўсёды выступаў выступаў супроць зажыму самакрытыкі і змагаўся з хваравітымі зьявамі, асобныя кіраўнічыя працаўнікі ўстановы і ячэйкі, цкавалі і цкуюць.

Тав. Чарнушэвіч (старшыня праўленьня Белдзяржстраху) падвёў тав. Фішара пад чыстку апарату.

Гэтае зацісканьне спрыяла роскквіту ў ячэйцы і ўстанове падхалімства і п'янства. Сама **парт'ячэйка не вяла ніякай барацьбы з праявамі правага ўхілу і прымірэнча адносілася да тых партыйцаў, якія адкрыта выступалі з анты-партыйнымі права-апартуністычнымі заявамі.**

Праверачная камісія павінна ўлічыць усе гэтыя факты і вызваліць ячэйку ад глушыцеляў самакрытыкі, п'яніц і антысэмітаў.

Ч.

ЯЧЭЙКА НА ПРАВЕРЦЫ

(Ячэйка КП(б)Б рабфаку БДУ, Менск)

Праверка і чыстка нашай ячэйкі праходзіць пад знакам шырокай дзелавой крытыкі і самакрытыкі. На працягу двух вечароў абмяркоўваўся даклад бюро аб рабоце ячэйкі. У спрэчках выступіла 50 чалавек.

Галоўная ўвага ячэйкі была накіравана на барацьбу з ухіламі ад лініі партыі, з хістаньнямі па ідэалёгічным фронце. Ячэйка рашуча асудзіла апартуністычную палітыку былога кіраўніцтва НКА. Рабфак, як першае зьвяно ў ланцугу навучальных устаноў, якія рыхтуюць новыя кадры спэцыялістых, на практыцы адчуваў увесь цяжар тэтай «палітыкі». Да 10-ці годзьдзя рабфаку (1928 г.) ліквы сацыяльнага складу студэнцтва аказаліся яўна пагражаючымі. З 70 проц. лік рабочых зьнізіўся да... 45 проц.

Былы дэкан рабфаку **Лойка,** які «добрасумленна» праводзіў «лінію» НКА, ня цікавіўся сацыяльным складам будучых спэцыялістых. Адсеў рабочых павялічваўся. З прыёму 1926-27 году адсеялася рабочых 21 проц.

Ячэйка з усёй энэргіяй выступіла на барацьбу з гэтымі зьявішчамі. Яна дэталёва вывучыла прычыны і прыняла рад мерапрыемстваў да выпраўленьня памылак. Былі накіраваны таварышы непасрэдна на прадпрыемствы для вярбоўкі рабочых на рабфак. Ячэйка хадайнічала і дабілася 50 дадатковых камандзіровак для рабочых і 30 для жанчын-работніц. У выніку лік рабочых у складзе студэнцтва ў гэтым годзе падняўся зноў да 70 проц.

Работа па вярбоўцы па рабфак новых кадраў рабочых прадпрацаваецца.

У барацьбе за марксыцкія мэтады выкладаньня на рабфаку ячэйка шмат чаго зрабіла. Асобныя выкладчыкі супраціўляюцца (праўда, пасыўна) гэтай барацьбе. Быў выпадак, калі адзін таварыш выступіў супроць камуністых-выкладчыкаў, якія ў штодзённай рабоце праводзяць партыйную лінію. Гэткае выступленьне, якое аб'ектыўна было накіравана супроць марксыцкай мэтадалёгіі, спаткала рашучы адпор з боку ўсёй масы студэнцтва. Але на жаль, ня з боку ўсіх выкладчыкаў. Некаторыя з апошніх моўчкі абыйшлі гэтае выступленьне замест таго, каб поўнасьцю адмежавацца ад яго.

Ячэйка прымала меры для ўзмацненьня камуністычнага ядра сярод выкладчыкаў, але належнага цералому ў гэтым напрамку яшчэ няма.

«Ахілесава пята» ў рабоце ячэйкі—сувязь з вытворчасьцю. У горадзе гэтая сувязь носіць чыста - фармальны характар. Студэнты - рабфакаўцы вельмі рэдка бываюць на заводах і фабрыках, вельмі мала зьвязаны з рабочымі клюбамі. У вёсцы справа абстаіць яшчэ горш. Рабфакаўцы ў час вакацый мала цікавяцца калектывізацыяй вёскі і амаль ніякай работы ў гэтым напрамку не праводзяць.

Партыйная дысцыпліна ў ячэйцы яшчэ не на належнай вышыні. Некаторыя таварышы ня выконваюць даручэньняў бюро ячэйкі. Ёсьць выпадкі няўплаты партыйных узносаў на працягу 4-х месяцаў, сыстэматычнага ненаведваньня сходаў і г. д.

Ня досыць уважліва адносяцца рабфакаўцы да вайсковай падрыхтоўкі.

Сацыялістычным спаборніцтвам ахоплены яшчэ ня ўсе студэнты. Частка студэнцтва адносіцца да спаборніцтва фармальна і лічыць гэта не сваёй справай.

СТУДЭНТ.

ЦАЛКАМ ДАЛУЧАЕМСЯ ДА ПЕРАДАВОЙ „ЗЬВЯЗДЫ"

Патрабуем суровых мер да нацыянал-дэмакратычных агентаў

Бюро парткалектыву швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» супольна з партактывам цалкам далучаецца да перадавой у газ. «ЗЬВЯЗДА» ад 30 кастрычніка аб нацыянал-дэмакратычнай вылазцы пры чысткі тав. Жылуновіча (ячэйка Наркамасьветы).

Бюро лічыць неабходным, каб партыйныя органы прынялі суровыя меры ў адносінах да камуністых, якія фактычна зьявіліся агентамі нацыянал-дэмакратызму і яго рупарам на чысткі парт'ячэйкі Наркамасьветы.

Бюро спадзяецца, што ўся Менская арганізацыя, як і ўся КП(б)Б пад пастаянным і моцным кіраўніцтвам ленінскага ЦК дасьць належны адпор нацыянал-дэмакратам, чым-бы яны не прыкрываліся.

ПАТРАБУЕМ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ З ПАРТЫ

(Рэзалюцыя ячэйкі КП(б)Б машыннага цэху 1-й друкарні БДВ).

Заслухаўшы інфармацыю аб новай нацыянал-дэмакратычнай вылазцы агульны сход ячэйкі машыннага цэху 1-й друкарні БДВ сумесна з беспартыйнымі рабочымі лічыць: 1) што група Ільючонка, Марука, і Цьвікевіча (партыйцы) абараняла контр-рэвалюцыйную нацыянал-дэмакратычную лінію ўжо досыць знаёмую нам з ранейшых выступленьняў нацыянал-дэмакратаў; 2) што гэта група сваім выступленьнем стала на чале нацыянал-дэмакратычнай атакі на партыю і яе Ленінскі ЦК, што паміж гэтай групай «партыйцаў» і нацыянал-дэмакратамі сьцерліся фактычна ўсе межы; 3) актывізацыя нацыянал-дэмакратыі павінна спаткаць самы рашучы адпор і ў першую чаргу трэба бязьлітасна ўдарыць па гэтай наглай вылазцы. Ня можа быць ніякіх прымірэнчых адносін да барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам не пакідаючы адначасова самай рашучай барацьбы як з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, так і з шавінізмамі ўсякага іншага гатунку; 4) сход патрабуе выключэньня гэтай групы з радоў партыі.

Згуртаванай, маналітнай калёнай спаткае КП(б)Б усякую вылазку нацыянал-дэмакратаў і дасьць па руках кожнаму, хто спаўзае з генэральнай лініі партыі. Выкрыем агентуру нацыянал-дэмакратаў у радох партыі!

Бальтавіцкі адпор усякім гмкненьням выкарыстаць чыстку партыі ў мэтах прапаганды варожых нам поглядаў!

Ухваляем выводы ячэйкі БДВ

(Рэзалюцыя агульнага сходу ячэйкі КП(б)Б Наркамасьветы)

1) Агульны сход ячэйкі НКА цалкам і поўнасьцю салідарызуецца з перадавой ЦО КП(б)Б «Зьвязда», дзе даецца ацэнка выступленьню групы Ільючонка, Марука, Ів. Цьвікевіча і М. Гарэцкага, якое па сутнасьці выяўляецца новай нацыянал-дэмакратычнай вылазкай.

Агульны сход ячэйкі НКА лічыць, што паміж гэтымі групай абараняла контр-рэвалюцыйную нацыянал-дэмакратычную лінію, што гэта група сваім выступленьнем стала на чале нацыянал-дэмакратычнай атакі на нашу партыю і яе Ленінскі ЦК і што паміж гэтай групай «партыйцаў» і нацыянал-дэмакратамі сьцерліся фактычна ўсе межы. Група Ільючонка, Марука і Цьвікевіча карысталася зброяй, якая ўзята з арсэналу польскага фашызму і беларускага нацыянал-дэмакратызму Заходняй Беларусі.

2) Ячэйка НКА далучаецца да патрабаваньня ячэйкі Камвузу аб выключэньні гэтай групы з партыі і ўхваляе пастанову ячэйкі БДВ аб выключэньні з партыі І. Цьвікевіча.

3) Ячэйка НКА вітае газэту «Зьвязда», якая пабальшавіцку і рашуча выкрывае ўсе праявы нацыянал-дэмакратызму.

4) Яшчэ больш завастрыць увагу перад кожным партыйцам ячэйкі на неабходнасьць рашучай і непрымірымай барацьбы з усімі ўхіламі ад ленінскай лініі партыі, узмацніць барацьбу з усімі праявамі нацыяналізму і шавінізму і асабліва з найбольш небясьпечным на даным этапе беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

Ячэйка праўгасу БДУ выключыла Марука з партыі

РЭЗАЛЮЦЫЯ АГУЎЛЬНАГА АДКРЫТАГА СХОДУ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б ПРАЎГАСУ БДУ

Заслухаўшы інфармацыю аб новай нацыянал-дэмакратычнай вылазцы і разабраўшы справу выступленьня на сходзе ячэйкі НКА, члена нашай ячэйкі т. Марука Янкі, агульны сход ячэйкі КП(б)Б Пэдфаку БДУ заяўляе: мы цалкам і поўнасьцю далучаемся да ацэнкі гэтага выступленьня, якая дадзена ў перадавым артыкуле газэты **«Зьвязда»** ад 30 кастрычніка 1929 году.

1. Агульны сход лічыць, што група Марука, Ільючонка і Цьвікевіча абараняла контр-рэвалюцыйную, нацыянал-дэмакратычную лінію, якая нашла сваё адбіцьцё ў радзе ранейшых выступленьняў, як ліст 3-х пісьменьнікаў, які быў рашуча асуджан усёй партыяй і ў прыватнасьці ячэйкай Пэдфаку, у выступленьні Глыбоцкага і інш. у час тэатральнай дыскусіі і ў некаторых артыкулах т. Жылуновіча ў часопісі «Полымя».

2. Гэта група сваім выступленьнем стала на чале нацыянал-дэмакратычнай атакі на партыю і яе Ленінскага ЦК. Янка Марук у прыватнасьці толькі паўтарыў нападкі на партыю і яе Ленінскі ЦК у больш наглай форме, якія ён рабіў у час трацкісцкай дыскусіі, як напрыклад: «Ня ўсё тое правільна, што ЦК праводзіць», «Я лічбам ня веру», «Сялянам рот заткнулі» і пры ацэнцы ліста трох пісьменьнікаў, дзе ён апраўдваў ліст пісьменьнікаў і галасаваў супроць рэзалюцыі прынятай сходам.

3. Гэта група «партыйцаў» сваімі выступленьнямі яўна дапамагае ў барацьбе нацыянал-дэмакратам супроць лініі партыі і Ленінскага ЦК у нас, а за мяжой гэта будзе скарыстана польскім фашызмам і беларускімі нацыянал-фашыстымі супроць рэвалюцыйнай барацьбы заходняга пралетарыяту, а таму агульны сход яч. КП(б)Б Пэдфаку рашуча асуджае выступленьне гэтай групы, як контр-рэвалюцыйнае выступленьне і пастанаўляе: выключыць т. Марука Янку з радоў партыі, а таксама патрабуе ад партыі выключэньня з радоў партыі т.т. Ільючонка, Цьвікевіча і інш. нацыянал-дэмакратаў.

4. Агульны сход з усёй рашучасьцю заяўляе, што ячэйка КП(б)Б Пэдфаку аддасьць усе свае сілы бальшавіцкаму ЦК КП(б)Б для барацьбы з усімі і ўсялякімі ухіламі ад ленінскай лініі партыі.

Мы заяўляем, што і ў далейшым будзем праводзіць бязьлітасную барацьбу супроць нацыянал-дэмакратызму, шавінізму і розных ухілаў ад генэральнай лініі партыі.

Лёзунгі да 12-й гадавіны Кастрычніка

1. Няхай жыве УсеКП(б) — кіраўнік і арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва. 2. Няхай жыве КП(б)Б — баявы атрад Усесаюзнай Ленінскай Камуністычнай партыі! 3. Няхай жыве XII гадавіна Кастрычніка! 4. Толькі сусьветны Кастрычнік вырве чалавецтва з пекла капіталістычнай эксплёатацыі і імпэрыялістычных войнаў. 5. Знаходзячыся на рубяжы Савецкага Саюзу з капіталістычным Захадам, БССР была, ёсьць і будзе верным фарпостам заваяваньняў Кастрычніка. 6. У адказ на ўзрастаючы ўздым рэвалюцыйнага руху, буржуазія рыхтуе новую вайну супроць Савецкага Саюзу — аплоту пралетарскай рэвалюцыі. Напружаным тэмпам нашага будаўніцтва зробім непераможнай савецкую краіну ў барацьбе з сусьветным капіталам. Будзем падрыхтаваны да абароны СССР — бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету. 7. Імпэрыялістыя ў саюзе з сацыял-фашыстымі рыхтуюць контр-рэвалюцыйную вайну супроць СССР. Прэч арганізатараў вайны! Няхай жыве Камінтэрн! 8. Прэч правакатараў новай вайны — кітайскіх мілітарыстых, агентаў сусьветнага імпэрыялізму! Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя ў Кітаі! 9. Шчырае прывітаньне рабочым і сялянам Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы ад працоўных БССР у дзень XII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. 10. Няхай жыве Чырвоная армія — верны вартавы межаў СССР і БССР! 11. Толькі ў саюзе з брацкімі сацыялістычнымі рэспублікамі, у Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік забясьпечана палітычнае, эканамічнае і культурнае разьвіцьцё БССР. 12. Магутным уздымам культуры, навукі і тэхнікі забясьпечым пасьпяховае выкананьне 5-цігадовага пляну будаўніцтва сацыялізму, ператорым БССР у непераможную крэпасьць сусьветнай рэвалюцыі. 13. Дамо рашучы адпор клясаваму ворагу, які прабуе тармазіць індустрыялізацыю савецкае краіны і сацыялістычную перабудову вёскі. 14. Наша будаўніцтва сацыялізму — частка сусьветнай рэвалюцыйнай барацьбы. 15. Вышай дысцыпліну, больш арганізацыі, больш самакрытыкі, больш сацыялістычнае спаборніцтва! 16. Адзіным магутным парывам непераможнай волі працоўных выканаем пяцігодку ў скарочаны тэрмін. 17. Вялікія задачы сацыялістычнага будаўніцтва — у цэнтр прафсаюзнай работы. 18. Толькі на падставе найшырэйшай самакрытыкі мас, толькі ўцягненьнем мільёнаў у актыўнае абгаварэньне і вырашэньне ўсіх пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва прафсаюзы выканаюць сваю задачу школы камунізму. 19. Узмацніць ролю пралетарыяту і яго практычны ўдзел у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. 20. Індустрыялізацыя краіны і калектывізацыя сельскае гаспадаркі— адзіны шлях перамогі труднасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва. 21. За суцэльную калектывізацыю цэлых вёсак, сельсаветаў і раёнаў. 22. За павышэньне якасьці прадукцыі, за зьніжэньне сабекошту. 23. Трэцяя пазыка індустрыялізацыі — буйны ўклад у справу пасьпяховага будаўніцтва сацыялізму. Усямерна замацуем падпіску. Ні аднаго сялянскага двара без аблігацыі 3-й пазыкі. 24. Саюз рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства — гэта непераможная крэпасьць, аб якую разаб'юцца намаганьні паноў і капіталістых. 25. Разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва СССР — асноўны шлях зьнішчэньня нацыянальнай розьні сярод працоўных. Удзесяцярым нашу энэргію па выкананьні пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва БССР. 26. Толькі ў БССР, як і ва ўсім Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, забясьпечана права на палітычнае, эканамічнае і культурнае разьвіцьцё працоўных усіх нацыянальнасьцяй. 27. Толькі пралетарская рэвалюцыя да канца вырашыла нацыянальнае пытаньне. 28. Узмоцнім інтэрнацыянальную салідарнасьць рабочае клясы і працоўных мас БССР. 29. За бязьлітасную барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам — дапаможнікам сусьветнага сацыял-фашызму. 30. Шырока разгорнем масавую самакрытыку, сьмела, пабальшавіцку ўсю працу і ўсё будаўніцтва пад агонь рабочае самакрытыкі. 31. Ачысьцім савецкі апарат ад чужых элемэнтаў і ад тых, што разабюракратаў і шкоднікаў. 32. Рашучае наступленьне сацыялізму абвастрае супраціўленьне клясавых ворагаў. Узмоцнім агонь па кулаку, нэпману, шкоднику і іх дапаможцах-бюракратах. 33. За рашучае вылучэньне новых пралетарскіх кадраў на кіруючыя баявыя пасты сацыялістычнага будаўніцтва. 34. За больш актыўны ўдзел працоўных жанчын у сацыялістычным будаўніцтве. За рашучае вылучэньне работніц і батрачак на кіруючую работу. 35. Перамагаючы клясавых ворагаў, узьнімаючы творчасьць мас праз саветы, будзем будаваць сацыялізм. Наперад, да дзяржавы-камуны! 36. Камсамол, шчыльней свае рады вакол камуністычнай партыі, на рашучае змаганьне за сацыялізм. 37. За энэргічную работу па загатоўках бульбы для рабочых Ленінграда і Масквы, праца якіх зьяўляецца асновай бурнага росту індустрыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі БССР. 38. Толькі сталёвае адзінства і згуртаванасьць партыі вакол Ленінскага ЦК забясьпечаць пасьпяховае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва. 39. За ідэйную вытрыманасьць Ленінскае партыі, за ачыстку яе радоў ад чужых элемэнтаў, за ўзмацненьне партыі новымі моцнымі пралетарскімі кадрамі. 40. За бязьлітасную барацьбу з правым ухілам, што зьяўляецца галоўнай небясьпекай адыходу ад генэральнай лініі партыі. За бязьлітасную барацьбу з шавінізмамі ўсіх колераў і асабліва на даным этапе з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Супроць «левых» загібаў, за адзіна правільную Ленінскую лінію Камуністычнай партыі, не паслабляючы барацьбы з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму. 41. КПЗБ, змагару з польскім фашызмам і беларускім нацыянал-фашызмам за інтарэсы рабочых і працоўных сялян, гарачае бальшавіцкае прывітаньне. 42. Перадавым рабочым і батракі, уступайце ў рады Ленінскай Камуністычнай партыі. 43. Сьмелым бальшавіцкім поступам сталёвых ленінскіх радоў уперад, да поўнай перамогі сацыялізму. 44. Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя і яе штаб — Камуністычны Інтэрнацыянал!

По Савецкай Беларусі

Дзень калектывізацыі даў 62 новыя калгасы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). У дзень калектывізацыі і ўраджаю на Бабруйшчыне арганізаваны ў 9 раёнах 62 новых калгасы на плошчы 23,800 гэктараў зямлі. У склад гэтых калгасаў уступіла 2.095 сем'яў. 7 калгасаў яшчэ не аформлены. У Слуцкім раёне, дзе да гэтага часу калектывізацыя праходзіла слаба, створана 14 новых калгасаў, у якія ўлілося 600 сем'яў. Значна палепшылася справа калектывізацыі ў Асіпавіцкім і інш. раёнах

Кулакі і гандляры пад апекаю глускіх земляўпарадчыкаў

ГЛУСК. (Наш кар.). Пры правядзеньні зямляўпарадкаваньня мястэчка Глуску мясцовыя арганізацыі груба скаж

Загатоўкі ільну—баявая задача

КУЛАЦКІМ ГАСПАДАРКАМ ПРАД'ЯВІМ ЦЬВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНІ

Забясьпечым загатоўчыя пункты хлебам і прамтаварамі

Наркамгандлю БССР зьвярнуўся в дырэктыўным лістом да ўсіх ільна-загатоўчых арганізацый і да акруговых інспэктароў гандлю, у якім адзначае, што кампанія загатоўкі ільну-валакна павінна насіць ударны характар.

Лён, які загатаўляецца зараз на пунктах, павінен па меры паступленьня бяз усякага затрыманьня тэрмінова адгружацца тэкстыльным прадпрыемствам і па нарадах экспартных арганізацый.

У інтарэсах пасьпяховага выкананьня загатовак ільну-валакна Наркамгандаль БССР запрапанаваў загатоўшчыкам зажыцьцявіць рад наступных мерапрыемстваў:

Зараз-жа павінна быць праверана, ці добра падрыхтаваны загатоўчы апарат для загатоўкі ільну, ці ёсьць належная колькасьць складачных памяшканьняў, прэсаў, упаковачных матар'ялаў. Загатоўшчыкам прапануецца ўжыць належныя меры да ўзмацненьня свайго апарату.

Усім загатоўчым арганізацыям трэба праверыць, ці забясьпечаны ільнаводныя раёны ў належнай колькасьці прамтаварамі для здавальненьня патрэб здатчыкаў ільну. У тых выпадках, калі прамтаварных фондаў не хапае, у ільна-загатоўчыя пункты павінны быць накіраваны прамтавары, якія ёсьць у гандлёвых арганізацыях.

У пунктах загатовак ільну павінна быць забясьпечана выдача хлеба, мануфактуры і інш. прамысловых тавараў здатчыкам ільну, згодна норм, вызначаных эканамічнай нарадай. Адначасова з гэтым трэба ўстанавіць кантроль за тым, каб выдача хлеба і прамтавараў здатчыкам ільну праходзіла без цаганіны.

Каб унікнуць памылак, якія назіраліся летась пры спагнаньні закантрактаванага ільну-валакна, трэба на гэту справу зьвярнуць асаблівую ўвагу. У сувязі з тым, што кантрактантам ужо выдана каля 60 проц. хлеба і што сёлета лён сабраны раней на 2-3 тыдні, чым летась, трэба перагледзець тэрміны здачы ільну кантрактантамі з такім разьлікам, каб паскорыць паступленьне закантрактаванага ільну. Перагляд тэрмінаў павінен праводзіцца на агульных сходах сялян - кантрактантаў ільну-валакна.

Наркамгандлю БССР в свайго боку лічыць магчымым, каб у лістападзе месяцы гэтага году было спагнана да 50 проц. закантрактаванага ільну.

Плян загатовак ільну прапануецца давесьці да асобных раёнаў, загатоўчых пунктаў і вёсак: асобна — па загатоўках і па спагнаньні закантрактаванага ільну.

Як адну з мер паляпшэньня справы загатовак ільну, Наркамгандаль рэкамэндуе арганізацыю рабочых брыгад і выезды адказных працаўнікоў у ільнаводныя раёны.

Кулацкім і заможным гаспадаркам трэба прад'яўляць цьвёрдыя заданьні па здачы ільну, дапускаючы прэміяваньне іх таварамі толькі пасьля поўнага выкананьня імі цьвёрдых заданьняў.

Загатоўчыя арганізацыі павінны разгарнуць шырокую кампанію вакол загатовак ільну, уцягваючы ў яе бядняцка-серадняцкую частку вёскі і ўсю вясковую грамадзкасьць.

Справы адносна злосных нявдатчыкаў ільну павінны накіроўвацца судовым органам для тэрміновага разгляду.

Асаблівую ўвагу загатоўшчыкам прапануецца зьвярнуць на пытаньні якасьці ільну, які здаецца на пункты. У сувязі в гэтым трэба свачасова забясьпечыць ільнаводныя гаспадаркі дрывамі для сушкі ільну і стварыць вакол пытаньня аб добраякаснай апрацоўцы ільну грамадзкую думку.

Здатчыкі фальсыфікаванага ільну павінны прыцягвацца да адказнасьці.

***

Наркамгандлю павялічыў плян загатовак ільну-валакна па БССР на лістапад месяц. Усяго на працягу лістапада павінна быць загатоўлена 5.000 тон ільну, в якіх: Белпаляводсаюзам — 2.850 тон, Белкаапсаюзам — 1.250 тон і Белдзяржгандлем — 900 тон.

Па акругах плян загатовак за лістапад разьмяркоўваецца наступным чынам: Віцебская акруга павінна даць — 1.550 тон, Аршанская — 1.000 тон, Полацкая — 850, Магілеўская — 750, Гомельская — 470, Менская — 160, Бабруйская — 150 і Мазырская — 70.

Хлебазагатоўкі

ХТО РАНЕЙ ВЫКАНАЕ ГАДАВЫ ПЛЯН

Мацней націсьнем на кулака і яго агентаў

ПАТРЭБЕН НОВЫ УЗДЫМ ЭНЭРГІІ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС

„ЗДАВАЙЦЕ СТОЛЬКІ, КОЛЬКІ ХТО МОЖА"

У радзе раёнаў Менскае акругі в самага пачатку хлебазагатовак ня быў зроблены належны націск на кулака ў тым сэнсе, каб прымусіць яго здаць хлебазагатоўшчыкам усе лішкі хлеба. На мясцох ня ўжываліся належныя закады, каб зламаць кулацкі сабатаж. Да апошняга часу хлебазагатоўкі праходзілі бадай выключна за лік хлебных лішкаў бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі, саўгасаў і калгасаў.

Кулацкаму сабатажу спрыяла тое, што для заможных гаспадарак **ня былі вызначаны цьвёрдыя лічбы хлеба, якія павінны былі быць ім зданы,** і адсутнасьць належнага кантролю за выкананьнем заданьняў. Акрамя таго, трэба адзначыць вялікі недаўлік **сапраўднай наяўнасьці лішкаў у кулацкіх гаспадарках.** У радзе раёнаў было дапушчана папушчэньне ў адносінах кулацкіх гаспадарак. Напрыклад, у Бягомльскім раёне ад кулацкай і заможнай часткі вёскі хлеба амаль не паступіла. Тлумачыцца гэта тым, што ў радзе населішчаў у камісіі дапамогі хлебазагатоўкам трапілі заможнікі. У шмат якіх населішчах мясцовыя работнікі мелі сваю ўласную ўстаноўку: **«Давайце столькі, колькі хто можа».** У выніку — кулакі здавалі па 5-7 пуд., як беднякі і сераднякі, і на гэтым супакоіліся. Некаторым кулаком Сьмілавіцкага раёну было вызначана здаць па 20-25 пуд. замест 200-300 пуд. лішкаў, якія ў іх ёсьць. Кулаком хутару Астравы, Самахвалавіцкага раёну, якія маюць па 1.000 пуд. лішкаў, вызначана здаць толькі па 20-40 пуд.

У адным в населішчаў Беларускага сельсавету, Астрашыцка - Гарадзецкага раёну, група кулакоў на сваім нелегальным сходзе пастанавіла: «не здаваць ніводнага фунту». Сабатаж кулакоў цягнуўся да апошняга часу, а мясцовыя органы былі ў ролі маўклівых назіральнікаў.

У Сьмілавіцкім, Астрашыцка - Гарадзецкім, Чэрвеньскім, Халопеніцкім, Бярэзінскім і інш. раёнах практыкавалася «ўраўніляўка». У Чэрвеньскім раёне на радзе сходаў былі вынесены пастановы — **«здаваць хлеб па магчымасьці».**

Трэба неадкладна ўжыць усе захады **грамадзкага і адміністрацыйнага ўзьдзеяньня на кулацкую верхавінку вёскі, прымусіць яе ў тэрміновым парадку здаць лішкі хлеба дзяржаве.** Трэба рашуча выкрываць, **бязьлітасна біць па апартуністычных ухілах у практычнай рабоце па правядзеньні хлебазагатовак.**

Я. І—н.

Лістапад--рашаючы месяц хлебазагатовак

На парадзе прадстаўнікоў хлебазагатоўчых арганізацый з прамовай, прысьвечанай хлебазагатоўчай кампаніі, выступіў Наркамгандлю СССР тав. Мікаян.

Лістапад,—заявіў тав. Мікаян,—будзе мець выключнае значэньне ў хлебазагатоўчай кампаніі, якая павінна цяперісьці пад лёзунгам: **«Хто раней выканае гадавы плян».** Патрэбен новы ўздым энэргіі бядняцка-серадняцкай грамадзкасьці і націск на кулацка-заможную верхавіну вёскі. Гэта дасьць магчымасьць пасьпяхова закончыць хлебазагатоўчую кампанію яшчэ раней намечанага тэрміну.

У мэтадах хлебазагатовак бягучага году мы маем нешта новае, што адрозьнівае нашы загатоўкі ад мінулых гадоў і кладзе пачатак новым адносінам паміж вёскай і горадам. Кантрактацыя збожжавых культур настолькі пашырылася, што пралажыла шлях да арганізацыі абмену прадуктаў паміж горадам і вёскай. Кантрактацыя збожжавых культур у гэтым годзе дапоўнена другімі мэтадамі, а іменна: давядзеньнем пляну хлебазагатовак да вёскі і да кулацкага двара. Вясковы плян хлебазагатовак—гэта вагар мабілізацыі вясковай бядняцка-серадняцкай грамадзкасьці і сіл рабочае клясы для барацьбы з кулацкай заможнай верхавінай вёскі, гэта той вагар, які забясьпечвае посьпех хлебазагатовак.

Адной з асноўных умоў пасьпяховага сканчэньня хлебазагатовак зьяўляецца рашучая барацьба супроць спэкулянтаў хлебам і супроць канкурэнцыі паміж загатоўшчыкамі.

***

КЛІЧАЎ. (Наш селькор). У Клічаўскім раёне хлебазагатоўкі выкананы пераважна бядняцка-серадняцкай часткай сялянства. Усюды беднякі і сераднякі добраахвотна выступалі на сходах і вызначалі колькасьць збожжа. Між тым, у Клічаўскім раёне ёсьць 83 індывідуальна спадаткаваныя кулакі, якія маглі і павінны былі выканаць заданьне ў 100 тон. Мясцовыя [illegible] нічога не зрабілі для таго, каб прымусіць кулака здаць свае лішкі ніводзін з заможнікаў ня быў прыцягнуты да адказнасьці, ня быў аштрафаваны.

СКРЫЎЛЕНЬНІ КЛЯСАВАЙ ЛІНІІ У БАБРУЙШЧЫНЕ

Пры правядзеньні хлебазагатовак па Бабруйскай акрузе ў большасьці раёнаў было дапушчана грубае скрыўленьне клясавай лініі. У Сьвіслацкім раёне плян хлебазагатовак быў вызначаны для ўсіх гаспадарак, нават да саматужнікаў і членаў саюзу ў мястэчках. У радзе месц практыкаваўся адміністрацыйны націск на серадняцка-бядняцкую частку сялянства пры значным недаабкладаньні кулакоў. Гэта адмоўна адбілася на ходзе хлебазагатовак. Выкананьне гадавога заданьня да 20-га кастрычніка ў разьмеры 40,3 проц. гаворыць аб тым, што тэмп хлебазагатовак па Бабруйскай акрузе яшчэ слабы, што большасьць кулакоў яшчэ ня выканала заданьня, хоць тэрміны ўжо даўно прайшлі.

Амаль **ні ў адным раёне кулакі ня былі прыцягнуты да адказнасьці за невыкананьне заданьня.** За апошні час у акрузе меў месца рад адкрытых і нават тэрарыстычных выступленьняў супроць вясковых актывістых. Ня гледзячы на гэта, органы суду і пракуратуры ня ўжывалі належнага націску на кулацкія гаспадаркі.

Што паказала абсьледваньне Аршанскага вузла

Матар'ялы аб шкодніцтве, апублікаваныя „Зьвяздой", пацьвердзіліся

(Ад нашага аршанскага караспандэнта)

У газэце «Зьвязда» нядаўна паведамлялася аб пастанове бюро аршанскага акругкому партыі наконт шкодніцтва і непарадкаў на Аршанскім чыгуначным вузле. Пастанова была вынесена на падставе расьсьледваньня спэцыяльна вылучанай камісіяй.

Што знайшла акамісія?

5 ВЫПАДКАЎ ШКОДНІЦТВА

Яна выявіла 5 выпадкаў сьвядомага шкодніцтва. Першы выпадак—з **лепельскім цягніком,** які быў накіраваны старшым стрэлачнікам **Гарадніком** на пуці ў дэпо, замест патрэбнага маршруту. Аварыя не здарылася толькі таму, што учынак **Гарадніка** быў свачасова заўважаны. Гараднік на сходзе рабочых крычаў: «Калі нярэйдзем на 8-гадзіннае дзяжурства, дык будзем біць вагоны». Гараднік мае цесную сувязь з аршанскімі царкоўнікамі.

Другі выпадак шкодніцтва—калі насустрэч ужо прынятаму цягніку быў накіраваны манэўровы цягнік. Аварыя не здарылася таму, што цягнік, які прыбываў, ішоў вельмі ціха.

Трэці выпадак—аварыя на 3-м разьезьдзе па лініі на Віцебск, якая прынесла страт на 14.000 руб.

Мелі месца таксама—самаўласнае накіраваньне вагонаў на галоўныя пуці насустрэч цягніком, злачынстны манцёра Каржыцкага і майстра Мартулёва, якія за адну і тую-ж працу на рамонце плацілі рабочым па два разы, а потым дзялілі грошы паміж сабою.

Вось 5 выпадкаў сьвядомага шкодніцтва. Камісія прызнала, што іншыя аварыі і непарадкі здараліся з прычыны адсутнасьці працдысцыпліны і нядбайнасьці агентаў дарогі да сваіх абавязкаў.

Што-ж дапамагала шкодніцтву на Аршанскім вузле?

ЧУЖЫ ЭЛЕМЭНТ—У РАБОЧЫМ АСЯРОДЗЬДЗІ

Па-першае, трэба сказаць, што **штат рабочых ст. Ворша на 47 проц. складаецца з рабочых,** якія прышлі працаваць на транспарт толькі ў 1920-21 годзе. 28 проц. агульнай колькасьці рабочых. Склад рабочых вузла засьмечаны антысавецкім і чужым элемэнтам. Ёсьць былыя гарадавыя, паліцэйскія, члены «союза русского народа», антысэміты і г. д.

Частка шкоднікаў трымала сувязь з царкоўнікамі. Засьмечанасьць апарату выклікала падзеньне працоўнай дысцыпліны і няўважлівыя адносіны да абавязкаў.

Адміністрацыя цацкалася са шкодным і нягодным элемэнтам. Ёсьць выпадкі, калі адміністрацыя на працягу паўгода выносіла 5-6 вымоў аднэй і тэй-жа асобе. У большасьці вымовы абвяшчаліся тым, хто мае свае ўласныя гаспадаркі. На гэты факт адміністрацыя не зьвяртала ўвагі.

Пытаньне аб праддысцыпліне на вузле ня было пастаўлена да таго часу, пакуль аб шкодніцтве не загаварыў цэнтральны друк.

ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ АБАРАНЯЛІ ПРАГУЛЬШЧЫКАЎ

Трэба сказаць, што прафсаюзныя арганізацыі ня толькі не дапамагалі адміністрацыі ўзмацняць працоўную дысцыпліну, а наадварот перашкаджалі ёй. Калі адміністрацыя звальняла з працы прагульшчыкаў і п'яніц, дык прафсаюзныя арганізацыі абаранялі лодыраў, даводзілі справу да вышэйшых судовых інстанцый і стваралі цяганіну.

Цікава, што, калі саюз у рэдкіх выпадках згаджаўся в звальненьнем, але у абарону прагульшчыкаў выступаў Менскі вучастак інспэкцыі працы дарогі. Няма чаму зьдзіўляцца, што прагульшчыкі, п'яніцы і шкоднікі ніколі не баяліся і заяўлялі: «пляваць на ўсіх, прафсаюз і інспэкцыя не дазволяць звальненьня».

Быў выпадак, калі мясцком цягі падмяніў сабой адміністрацыю. Начальнік вучастку цягі зьняў в працы 3-х камсамольцаў, якія адмовіліся ехаць змаячкамі на цягніку, у той час, калі змаячкаў не хапала. Мясцком усіх зьнятых аднавіў на працы бяз ведама адміністрацыі дарогі. Вось як прафсаюзныя арганізацыі вузла вразумелі дырэктыву **МАСАВАЯ РАБОТА—У ЗАНЯПАДЗЕ**

У «Зьвязьдзе» ўжо паведамлялася аб тым, што прафсаюзная і масава-выхаваўчая работа на Аршанскім вузле была ў заняпадзе.

Трэба дадаць, што прафсаюзныя арганізацыі вельмі прымірэнча адносіліся да выпадкаў п'янства, недысцыплінаванасьці і неахайнасьці. Пытаньне ўзмацненьня працдысцыпліны ніколі ня ставілася на сходах рабочых.

Пытаньні пяцігодкі, ажыўленьня работы вытворчых нарад, сацыялістычнага спаборніцтва не занялі належнае месца ў рабоце прафарганізацый.

Зусім не разгорнута была самакрытыка. На сходах выказваліся па 2-3 рабочых.

Насьценгазэта «Тачыла» карысталася вельмі малой увагай з боку прафарганізацый. Не вялося ніякай выхаваўчай работы сярод новых рабочых.

ПАРТКІРАЎНІЦТВА НЯ СПРАВІЛАСЯ СА СВАІМІ ЗАДАЧАМІ

Трэба спыніцца і на парткіраўніцтве. Парткіраўніцтва на вузле таксама кульгала, як і прафэсіянальнае. Бюро парткалектыву зусім мала ўвагі зварочвала на пытаньне палепшаньня і рацыяналізацыі гаспадаркі, на ўзмацненьне працоўнае дысцыпліны. Бюро парткалектыву не мабілізавала ўвагі рабочых на выпадках шкодніцтва.

Партыйны калектыў працаваў спакойна, павольна, нішто не хвалявала яго, пакуль не прагрымеў гром.

«ЗЬВЯЗДА» ПРАВІЛЬНА СЫГНАЛІЗАВАЛА АБ ШКОДНІЦТВЕ

Бюро Аршанскага акругкому партыі згадзілася з вывадамі камісіі. Бюро прызнала, **што факты, адзначаныя ў артыкулах газэты «Зьвязда»,** за выключэньнем факту разгону брыгад, адпавядаюць сапраўднасьці.

Бюро акругкому пастанавіла зьняць з работы сакратара бюро парткалектыву т. Румо і старшыню вучпрафсюзу тав. Макарэвіча.

Арыштавана 8 чалавек: майстар **Мартулаў,** манцёр—**Каржыцкі,** нач. разьезду **Харашча,** яго памочнік—**Глебаў,** старшы стрэлачнік—**Гараднік,** стрэлачнік **Старавойтаў,** машыністы і яго памочнік.

Наш адказ ныцікам і малаверам

Ліст рабочых заводу „Камунар"

Мы, рабочыя, служачыя і тэхнічны персанал мэталюргічнага заводу «Камунар», у колькасьці 650 чалавек, в вялікім здавальненьнем прымаем выклік рабочых мэталюргічных заводаў Днепрапятроўску.

Адзін толькі год існуе наш завод, які аб'ядная тры былыя саматужныя заводы. За адзін год лік рабочых ад 450 на былых трох заводах павялічыўся да 650.

Палепшылася і матар'яльнае становішча рабочых. Так, да аб'яднаньня сярэдні заработак рабочага складаў 60-70 руб., зараз—звыш 120 руб.

Падпіска на пазыку індустрыялізацыі дала 109 проц. месячнай зарплаты. **Мы абавязваемся даць яшчэ дадатковую падпіску і ўцягнуць тых рабочых, якія толькі нядаўна прыбылі на завод.**

У дзяржаўны апарат нашы рабочыя вылучылі 10 чал. Наш рабочы стаў намесьнікам дырэктара завода «Камунар».

Сацыялістычным спаборніцтвам ахоплены амаль увесь калектыў. Звыш 50 чалавек падалі заявы аб добраахвотным зьніжэньні расцэнак, што дало зьніжэньне сабекошту на 15 проц. Прагулы на заводзе зьнізіліся да 0,07 проц. Вытворчая праграма намі выканана з перавышэньнем на 9 проц.—109 проц. заданьня.

За лепшы ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве калектыў ЛКСМБ заводу атрымаў пераходны сьцяг ад ВСНГБ. Мы спадзяёмся ня толькі ўтрымаць гэтую ўзнагароду, але атрымаць ад ураду ордэн Чырвонага Працоўнага Сьцягу.

Перад намі вялікія і цяжкія задачы. Але мы з імі справімся і абяцаем перавыканаць кантрольныя лічбы на 1929-30 год.

Мы абавязваемся ў другім годзе пяцігодкі зьнізіць сабекошт прадукцыі ва што-б там ні стала на 12 проц. Мы ведаем, што калдагавор—гэта двухбаковы абавязак. Мы абяцаем змагацца з рвацкімі настроямі асобных рабочых, для выкананьня кантрольных лічбаў уступіць ва ўдарныя брыгады.

Вяручы на сябе абавязкі па выкананьні кантрольных лічбаў, мы просім кіруючыя органы забясьпечыць выкананьне адміністрацыяй заводу наступных умоў:

1) **Поўная нагрузка рабочага дня, бесьперабойнае забясьпячэньне заводу патрэбным сырцом і абсталяваньнем.**

2) **Свячасовае выкананьне ва ўстаноўленыя тэрміны прапаноў вытворчых камісій, прынятых адміністрацыяй, а таксама абавязацельстваў па ахове працы і тэхніцы бясьпечнасьці.**

3) **Белмясатрэст павінен больш уважліва адносіцца да патрэб завода.**

4) **Капітальнае будаўніцтва павінна праводзіцца [illegible] плянава, ва ўстаноўленыя тэрміны. Рабочы калектыў заводу павінен ведаць пяцігадовы плян і далейшыя пэрспэктывы заводу.**

5) **Адміністрацыя павінна хутка ажыцьцяўляць рабочыя вынаходкі і больш дапамагаць вынаходцам.**

Узятыя намі абавязацельствы зьяўляюцца лепшым адказам і адпорам ныцікам, малаверам і правым ухілістым.

Наш лёзунг: «Выканаць пяцігодку за 4 гады».

Ад імя калектыву рабочых, служачых і тэхнэрсаналу заводу «Камунар»

Бюро ячэйкі КП(б)Б.

Заводзкі камітэт зав. «Камунар».

За Меншвэм--„Камунар", „Чырвоная Зара" і „Эльвод"

Штодзённа новыя прадпрыемствы далучаюцца да ліста Днепрапятроўскіх мэталістых

АРГАНІЗУЕМ МАСАВАЕ АБГАВАРЭНЬНЕ КАЛДАГАВАРОЎ, ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ВЫКАНАНЬНЕ УЗЯТЫХ РАБОЧЫМІ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

Больш за 3.000 рабочых Менску адгукнуліся на заклік днепрапятроўцаў

24-га кастрычніка «Зьвязда» надрукавала адкрыт ліст днепрапятроўскіх мэталістых да ўсіх рабочых Саюзу. «Зьвязда» заклікала рабочых БССР адгукнуцца на ліст днепроўскіх рабочых і пасьледаваць іх прыкладу.

Заклік «Зьвязды» знайшоў гарачы водгук. Ужо 25-га кастрычніка на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» адбыўся сход рабочых, на якім абмяркоўвалася прапанова днепрапятроўскіх пралетараў. Рабочыя «Дрэваапрацоўшчыка» зьвярнуліся на старонках «Зьвязды» з лістом да ўсіх дрэваапрацоўшчыкаў БССР. Рабочыя «Дрэваапрацоўшчыка» абавязаліся правесьці масавы агляд старога калдагавору. Для гэтага кожны цэх вылучыў брыгаду з 5 чал. Рабочыя абяцалі весьці рашучую барацьбу з дробна-буржуазнымі кістаньнямі сярод адсталых груп рабочых і даць у часе кампаніі перазаключэньня калдагавораў рашучы адпор рвачом, прагульшчыкам і сымулянтам.

У той-жа дзень, 25-га кастрычніка, ліст днепроўскіх мэталістых стаяў на парадку дня партыйнага і прафэсыянальнага актыву Кастрычніцкага раёну. Актыў вітаў ініцыятыву пралетараў Днепрапятроўску і заклікаў рабочых правесьці калдагаворную кампанію пад лёзунгамі павышэньня прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня сабекошту, 100-процантнага ахопу рабочых сацыялістычным спаборніцтвам і поўнага ўзамернага выкананьня абавязацельстваў.

28-га кастрычніка гэтае пытаньне абмяркоўвалася і на партыйным і прафэсыянальным актыве Фрунзаўскага раёну, дзе дэлегацыя 1.500 рабочых фабрыкі «Кастрычнік» (Меншвэй) зачытала адкрыты ліст да ўсіх швэйнікаў БССР. Рабочыя «Кастрычніка» абавязаліся павысіць прадукцыйнасьць працы на 40 проц., зьнізіць сабекошт прадукцыі на 11 проц., ліквідаваць прастоі, арганізаваць масавую праверку калдагавораў.

Сёньня мы друкуем два лісты рабочых заводаў «Камунар», «Чырвоная Зара» і пастанову сходу рабочых Эльводу.

Акрамя таго, паводле вестак, якія мае рэдакцыя, ліст днепрапятроўцаў абмяркоўваўся рабочымі 1-й дзяржаўнай друкарні.

Вітаючы пачынаньне рабочых «Дрэваапрацоўшчыка», «Кастрычніка», «Камунара» і «Чырвонай Зары», мы спадзяёмся, што за імі пойдуць рабочыя іншых заводаў БССР. Мы ўпэўнены, што абавязацельствы, узятыя на сябе рабочымі, будуць поўнасьцю выкананы. Мы чакаем паведамленьняў аб працы аглядавых брыгад, аб масавым удзеле рабочых у абмеркаваньні калдагавораў. Мы чакаем канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьні палітыка-выхаваўчай работы сярод новых рабочых, якія нядаўна прышлі на завод з вёскі.

ВЫКАНАЦЬ ПЯЦІГОДКУ ЗА 4 ГАДЫ

Ліст рабочых дражджавога заводу „Чырвоная Зара" да ўсіх рабочых— харчавікоў БССР

Мы, рабочыя і служачыя дражджавога заводу «Чырвоная Зара», абгаварылі ліст днепрапятроўскіх рабочых і лічым патрэбным зьвярнуцца з наступнай адозвай да ўсіх рабочых-харчавікоў БССР.

— Пасьля польскай акупацыі наш завод апынуўся ў надзвычайна цяжкім становішчы. На ім працавала толькі 60 чалавек, не хапала сырцу, ня было дроў. Зараз, праз 10 год, лік рабочых павялічыўся ў 3 разы — да 172 чал., завод на 50 проц. электрыфікаваны, мы забясьпечаны поўнасьцю сырцом.

Аб посьпехах заводу добра гаворацъ наступныя лічбы: у 1921-22 годзе мы выпрацавалі 242 тоны дрожджаў, у мінулым годзе — 2.500 тон. Павялічэньне на 1000 проц.!

Сярэдні выхад дрожджаў з пуда сырцу складаў у 1921-22 годзе 12 фунт. зараз — 28,66 фунт.

Сабекошт аднаго кілё дрожджаў зьменшыўся за 5 год в 52,3 кап. да 33 кап.; прадукцыйнасьць працы павялічылася за 5 год больш чым на 50 процантаў.

Рос завод, палепшаўся і матар'яльны добрабыт рабочых. Сярэдняя зарплата на заводзе ў 1923-24 годзе складала 36 р. 75 к., у мінулым годзе — 67 руб. 25 кап.

Наш завод выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва маскоўскія, кіеўскія і рад беларускіх дражджавых заводаў.

Дзякуючы спаборніцтву, прадукцыйнасьць працы на заводзе за апошнія месяцы павялічылася на 12 проц.

Рабочыя заводу далі 100 проц. падпіску на 2-ю і 3-ю пазыкі індустрыялізацыі. Мы адпрацавалі адзін дзень у карысьць індустрыялізацыі, зараз мы адпрацоўваем другі дзень на гэтую-ж мэту.

Трэба праўду сказаць, завод яшчэ не пазбавіўся ад раду адмоўных зьяўішчаў у 4-м квартале мінулага году сабекошт прадукцыі вырас на 2,8 проц. (у параўнаньні в 3-м кварталам); завод не працаваў в поўнай нагрузкай, ня ўсе рабочыя наведваюць вытворчыя нарады і агульныя сходы.

Рабочая брыгада праверыла выкананьне сацыялістычнага дагавору і склала праект новага дагавору, у які намі ўключаны рад пунктаў, што маюць мэтай далейшую сацыялістычную рацыяналізацыю вытворчасьці.

Мы абавязваемся выканаць вытворчую праграму на ўсе 100 проц., зьнізіць прагулы і брак прадукцыі да нуля, павялічыць прадукцыйнасьць працы на 8 проц. і г. д.

Мы абавязваемся даць рашучы адпор рвацкім настроям, усім тым, хто будзе перашкаджаць выкананьню пляну другога году пяцігодкі.

Мы заклікаем усіх харчавікоў БССР ужыць усе меры да выкананьня прамыслова - фінансавага пляну другога году пяцігодкі, да выкананьня 5-годкі ў чатыры гады.

На даручэньні агульнага сходу рабочых заводу «Чырвоная Зара» МАНЬКОЎ, ЭЛЬКІНД І ГАЛЬПЭРЫН.

Прымаем выклік днепрапятроўцаў

(Эльвод, Менск)

Пазаўчора адбыўся агульны сход рабочых і служачых Эльводу, на якім абмяркоўваўся ліст днепрапятроўскіх мэталістых. Сход ухваліў пастанову, у якой вітае ініцыятыву рабочых Днепрапятроўску і прымае на сябе абавязак змагацца з рвацтвам, п'янствам і нядбайнасьцю ў рабоце, а таксама дадатковa падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Рабочыя Эльводу выклікалі на дадатковую падпіску на пазыку рабочых Гомельскай электрастанцыі і заводу «Энэргія»

Забясьпечым рэальную зарплату рабочых

Пралетар ад прылаўку—на дапамогу пралетару ад варштату

Рабочыя Маскоўскага электразаводу зьвярнуліся з адкрытым лістом у рэдакцыю «Торгово-Промышленной Газеты», у якім адзначаюць, што другі год пяцігодкі ставіць перад рабочай клясай вялізарныя задачы, выкананьне якіх патрабуе жалезнай дысцыпліны і вытрыманасьці.

Мы павінны дабіцца,—пішуць рабочыя,—і даб'ёмся павышэньня прадукцыйнасьці працы і зьніжэньня сабекошту. Тыя калдагавары, якія будуць заключаны ў гэтым годзе, будуць мець характар узаемных абавязацельстваў. Прафсаюзы павінны будуць гарантаваць выкананьне рабочымі калектывамі прадпрыемстваў узятых на сябе абавязацельстваў як у галіне колькасьці, так і якасьці. Але, з другога боку, **трэба забясьпечыць вызначаны плянам рост рэальнай заработнай платы.** А ў гэтым сэнсе вельмі шмат можа і павінна зрабіць каапэрацыя. **Прылавак у сучасных умовах ператвараецца ў палітычны пост.** У калдагаворную кампанію павінны ўключацца таксама і каапэратывы.

Рабочыя фабрык і заводаў **павінны дабіцца жалезнай дысцыпліны працы.** Армія каапэрацыйных работнікаў **павінна ім у гэтым дапамагчы.** Трэба палепшыць тэхніку гандлю, наладзіць загатоўчы апарат, трэба ўзяць пад абстрэл усю работу каапэрацыйнага апарату.

Кантрольныя лічбы прадугледжваюць рост рэальнай зарплаты, задача каапэрацыі,—канчаюць рабочыя свой ліст, —**забясьпечыць нам гэты рост у тэй меры, у якой ён залежыць ад узроўню цэн.**

Зьмяшчаючы гэты ліст, «Торгово-Промышленная Газета» адначасова зварачаецца з заклікам да Баўманаўскага раённага каапэратыву МОСНО, у якім зазначае, што **рабочыя электразаводу маюць рацыю,** калі яны патрабуюць, каб, адначасова з палепшэньнем работы прамысловых прадпрыемстваў, **палепшылася і работа гандлёвага апарату.**

***

У нас, па БССР, ужо таксама разгарнулася кампанія па заключэньні новых калектыўных дагавораў. Рабочыя раду прадпрыемстваў Менску падпісалі ўжо рад абавязацельстваў аб палепшэньні якасьці працы, узьняцьці працоўнай дысцыпліны ў новым гаспадарчым годзе. Мы лічым, што **каапэрацыя БССР таксама павінна прыняць удзел у гэтым руху.** Сацыялістычнае спаборніцтва дагэтуль мала яшчэ захапіла работнікаў каапэрацыі. Сацыялістычнае спаборніцтва ў каапэрацыі трэба ўвязаць са спаборніцтвам на найбольш буйных прадпрыемствах.

Мы зварачаемся да ўсіх прафсаюзных, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый з **прапановаю абмеркаваць гэтае пытаньне на шырокіх рабочых сходах.** Гэта дасьць магчымасьць знайсьці новыя формы ўзаемаадносін паміж рабочымі і забясьпечваючымі іх арганізацыямі—каапэратывамі, гэта дасьць магчымасьць стварыць на прадпрыемствах атмасфэру сапраўднага вытворчага энтузіязму.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія рэдкалегій насьценгазэт пачалася

Партыйныя і грамадзкія арганізацыі на мясцох слаба праводзяць падрыхтоўчую працу да перавыбараў. Пры такім тэмпе работы—ёсьць небясьпека зрыву ў асобных арганізацыях справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Усім партыйным арганізацыям трэба зараз-жа праверыць, як выконваюцца дырэктывы ЦК КП(б)Б аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі

СЛАБАЯ ПАДРЫХТОЎКА

З першага лістапада па Аршанскай акрузе пачынаецца перавыбарчая кампанія рэдкалегій насьценных газэт. Фактычна в гэтага часу яна пачнецца толькі на раёнах, бо ў горадзе яна пачалася ўжо. У горадзе ўжо праведзены перавыбары рэдкалегій 2 насьценных газэт—дому асьветы і пэдтэхнікуму. Перавыбары рэдкалегій іншых насьценгазэт будуць праведзены пасьля першага лістапада. Асаблівай падрыхтоўкі да перавыбараў няма. Таварышы з рэдкалегій насьценгазэты Днепрасаюзу мне казалі:

— Аб тым, што з першага лістапада пачынаецца перавыбарчая кампанія, — мы ўсе добра ведаем. Падрыхтоўкі пакуль што ніякай не вядзем. У часе перавыбараў, на сходзе паставім даклады і зробім перавыбары.

Таксама і ў другіх.

27 кастрычніка ў Воршы адбыўся агульна-гарадзкі сход рабкораў, на якім абгаворваліся пытаньні аб перавыбарах рэдкалегій насьценгазэт і падрыхтоўцы да іх. Трэба адзначыць, што на гэты сход зьявілася мала рабкораў. За апошнія часы наогул стала ўсё трудней і трудней зьбіраць рабкораўскія сходы, а калі яны і зьбіраюцца, дык на іх мала прыходзіць рабкораў.

На раёнах падрыхтоўчая праца да перавыбараў толькі пачалася. Нядаўна акругком партыі разаслаў усім райкомам дырэктыўны ліст, як праводзіць падрыхтоўку да перавыбараў рэдкалегій насьценгазэт і як праводзіць і самыя перавыбары. А. Мілашэўсці.

Якая праца, такія і вынікі

Падрыхтоўчая праца і перавыбары рэдкалегій насьценных газэт на Магілеўшчыне знаходзяцца ў заняпадзе.

Да гэтага часу амаль што ніякай падрыхтоўчай працы не праведзена.

Акругком КП(б)Б да 27 кастрычніка нават ня вылучыў таварыша ад акругкому для правядзеньня гэтае працы. Наглядаецца гэта самае і ў гаркоме КП(б)Б.

Плян правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі па горадзе толькі 26 кастрычніка быў зацьверджаны гаркомам. На другі дзень быў зацьверджаны акругкомам акруговы плян.

Гарком КП(б)Б быў ня згодзен заразжа праводзіць працу. 26 кастрычніка пастанавіў адлажыць правядзеньне гэтае кампаніі, але акругком не згадзіўся і адмяніў пастанову гаркому.

Ня гледзячы на тое, што в першага лістапада пачынаецца перавыбарчая кампанія, а на Магілеўшчыне трэба распачынаць яшчэ падрыхтоўчую працу. Ячэйкі амаль што ніякай увагі не зьвярнулі на гэтую кампанію. Дзякуючы такой «падрыхтоўцы», на нараду рабкораў г. Магілеву, якую склікала акруговая газэта «Магілеўскі Селянін» на 29 кастрычніка, зьявілася ўсяго 3 чалавекі і нарада была сарвана.

Да перавыбараў рэдкалегіі ня рыхтуюцца

(Менск—Чыгуначны вузел)

Ня гледзячы на пастанову ЦК КП(б)Б, у якой завастралася ўвага ўсіх партыйных арганізацый на неабходнасьць шырокай і дакладнай падрыхтоўкі да перавыбарчай кампаніі рэдкалегій—асобныя ячэйкі ў гэтым напрамку нічога ня робяць.

Партарганізацыя чыгуначнага вузла (Менск) да гэтага часу зусім не прыступіла да падрыхтоўкі пер

МЕНСК

АО „незаменным спэцы" і яго абаронцах

АБО ЯК ЗАВОДАКІРАЎНІЦТВА ГОМЕЛЬСКАГА ЗАВОДУ „ПРАЛЕТАРЫ" РЭАГУЕ НА ПРАПАНОВЫ РАБОЧЫХ

З даўняга часу рабочыя наглядаюць, як на заводзе «Пралетары» (Гомель) нажываецца праватнік **Кадзінаў.** Гэты Кадзінаў займаецца перавозкай і адпраўкай розных грузаў заводу і чамусьці лічыўся «незаменным» спэцам. Ён карыстаўся сваім манапольным становішчам і кожны месяц зарабляў шмат грошай. Вельмі пераканаўча гэта паказвае выпіска бухгальтэрыі заводу з асабістага раху Кадзінава. За 11 месяцаў мінулага 1928-29 году ён выкачаў з заводу 4.166 руб. Па некаторых месяцах ёсьць нават такія сумы: сьнежань 1928 г.—481 руб. 51 к., красавік 1929 году—725 руб., чэрвень—718 руб. і г. д. Але гэтыя сумы далёка ня поўныя. Гэты «спец» дзейнічае па ўсіх правілах заўзятага эксплёататара. Для перавозкі вялікіх грузаў ён набірае сабе за мізэрную плату беспрацоўных з вёскі, а сабе пакідае пераважную частку грошай з кожнай такой апэрацыі.

Маўчалі, маўчалі рабочыя і, нарэшце, некалькі месяцаў таму назад парашылі зьясьніць гэтае пытаньне праз сваю друкаваную заводзкую газэту «Чырвоная Вагранка».

Вось, што гаворыцца з гэтага поваду ў заметцы пад назвай «Ці патрэбен Кадзінаў»:

«Сувязь з прыватнікам на нашым заводзе ня спыняецца і па сёньняшнім дзень. Пытаньне ідзе аб дастаўцы і адпраўцы розных грузаў на завод і з заводу на станцыю. Праўда, наш транспарт ня можа справіцца з усімі гэтымі апэрацыямі, але з гэтага не вынікае, каб прыватнік выцягваў з заводу грошы тысячамі. Трэба заразжа, каму належыць, спыніць гэта недапушчальнае зьявішча».

Заметку на заводзе чыталі з вялікай зацікаўленасьцю. Група рабочых у часе абедзенага перапынку падазвала да сябе Кадзінава, прачытала яму заметку і заявіла: «Ну, цяпер табе—крышка».

Але на Кадзінава гэта ня мела ўплыву. Ён быў спакойны.

А заводакіраўніцтва?

Заводакіраўніцтва нічога не зрабіла, каб паставіць пытаньне на практычныя рэйкі, і абмежавалася наступным бюракратычным адказам у газэце:

«Ці патрэбен Кадзінаў? На жаль, трэба адказаць, што патрэбен. Ня гледзячы на ўсе намаганьні заводакіраўніцтва заключыць дагавор з Саўгандальфлётам і з Транспартнікам, гэтага зрабіць ня ўдасца. Па-першае, ня хочуць займацца з цяжкімі грузамі, а падругое, бяруць у тры разы больш, чым Кадзінаў.

Мы плацім 7 руб. 50 к. з тоны да пагрузачнай станцыі і былі-б вельмі задаволены здаць дзяржаўнай арганізацыі, каб уніклуць усякіх гутарак».

Трудна сказаць, чаго ў гэтым адказе больш: простага людзкога глупства, або абураючых неахайных бюракратычных адносін да прапаноў рабочых.

Ня дзіва, што рабочыя з нездавальненьнем прачыталі адказ заводакіраўніцтва.

Што-ж далей? А далей выявілася, што з Саўгандальфлётам аб усёй транспартна-экспэдыцыйнай рабоце на заводзе не дагаворваліся, што Гомельская гарадзкая станцыя Зах. чыг. афіцыйна выказала згоду ўзяць на сябе ўсю транспартна-экспэдыцыйную работу заводу, у тым ліку і перавозку ўсіх цяжкіх грузаў.

А заводакіраўніцтва пакуль што ўсё яшчэ маўчыць.

Нам здаецца, што з усёй гэтай гісторыі Гомельскай АКК трэба зрабіць некаторыя вывады і «ўзнагарадзіць» заводакіраўніцтва па заслугах за такія бюракратычныя адносіны да прапаноў рабочых і прымусіць яго надалей больш уважліва і падзелавому рэагаваць на заметкі ў друкаванай заводзкай газэце.

ГОМЕЛЬСКІ.

Швэйнікі ўзялі шэфства над Наркамгандлем і Белдзяржгандлем

На агульным сходзе швэйнікаў ф-кі «Акцябр» была заслухана інфармацыя аб бюракратызьме ў дзяржапараце, аб скажэньнях клясавай лініі і аб тым, што павінны рабіць рабочыя, каб зьнішчыць гэтыя недахопы. Агульны сход рабочых пастанавіў прыняць шэфства над Наркамгандлям і Белдзяржгандлем па прыкладзе рабочых электразаводу ў Маскве. Рабочыя ф-кі «Акцябр» выклікаюць таксама віцебскіх, гомельскіх, бабруйскіх і магілеўскіх швэйнікаў, каб апошнія ўзялі шэфства над мясцовымі органамі Наркамгандлю і аддзяленьнямі Белдзяржгандлю. Выкліканы заводы «Камунар», «Бальшавік» і менскія чыгуначныя майстэрні пасьледаваць прыкладу менскіх швэйнікаў.

Дэпутаты гарсавету даюць справаздачу выбаршчыкам

Кошт будаўніцтва ў Менску —5 мільён. рублёў

З 10-га лістапада па прадпрыемствах пачынаецца справаздачная кампанія дэпутатаў Менскага гарадзкога савету перад сваімі выбаршчыкамі.

Гарсавет падрыхтаваў матар'ял аб сваёй дзейнасьці за апошні час. У матар'ялах адзначаецца вялікае разьвіццё будаўніцтва ў горадзе. Менск сёлета будуе на 5 мільёнаў рублёў. Значна павялічыўся выпуск цэглы. Так, у мінулым годзе цагельні Менску выпрацавалі 16 мільёнаў 500 тысяч штук цэглы, а ў гэтым годзе — 23 мільёны штук — на 39% больш. У гэтым сэзоне часткова скончана пабудова каля 300 новых кватэр. Сёлета будуць заселены 202 кватэры, 30 пакояў і інтэрнат на 80 чал.

За мінулы год выпуск валавой прадукцыі і цэнзавай прамысловасьці гор. Менску павялічыўся на 21 мільён рублёў, — на 73% больш, чым у мінулым годзе. Лік рабочых на прадпрыемствах павялічыўся на 2.900 чал., — павялічэньне на 47%.

Агульна-гарадзкая нарада членаў МОПР'у ЖАКТ'аўскіх ячэек

У панядзелак, 4-XI, а 7 гадз. увеч., у клюбе харчавікоў (Школьная, № 1)

—— АДБУДЗЕЦЦА ——

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ НАРАДА

членаў МОПР'у ЖАКТ'аўскіх ячэек,

па пытаньнях аб бліжэйшых задачах МОПР-работы:

1) Аб усесаюзным агляднзе МОПР-ячэек. 2) Аб кампаніі зімовай дапамогі.

Просьба не спазьніцца. Пасьля нарады—**КІНО.**

МЕН. АК МОПР. БЕЛЖЫЛСАЮЗ.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА

Сёньня, 2-га лістапада, а 8-й гадзіне ўвечары ў Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68) адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД ПІСЬМЕНЬНІКАЎ ГОР. МЕНСКУ

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Пераабраньне старшыні праўленьня.
2. Бягучыя справы.

Прадстаўнікі калгасаў у т. Галадзеда

Учора старшыня Саўнаркому тав. Галадзед меў двухгадзінную гутарку з прадстаўнікамі калгасаў Бабруйшчыны, Магілеўшчыны і Меншчыны, якія суправаджалі эшалёны з бульбай. Калгасьнікі расказалі тав. Галадзеду аб сваіх дасягненьнях. Усе выступаўшыя адзначалі вялікі ўплыў калгасаў на вакольчае сялянства, вялікі рост ураджайнасьці ў калгасах і паляпшэньне жывёлагадоўлі.

Калгасьнікі прасілі зьвярнуць увагу на слабое забесьпячэньне калгасаў машынамі. Да гэтага часу таксама недастаткова разгорнута сетка ясьляў у калгасах.

Тав. ГАЛАДЗЕД адказаў на ўсе пытаньні калгасьнікаў і ў сваёй прамове адзначыў, па якіх шляхох павінна пайсьці далейшае калгаснае будаўніцтва.

Вайсковы паход студэнцтва

31-га кастрычніка адбыўся вялікі вайсковы паход студэнтаў усіх факультэтаў Беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту, а таксама камбузу і слухачоў Палітэхнікуму. Усяго ў паходзе прыняло ўдзел кала 4.000 чалавек.

Вайсковы кіраўнік БДУ тав. Пятроў у гутарцы з нашым супрацаўніком паведаміў:

— Мэтаю выхаду было нагляднае азнаямленьне студэнтаў з дзеяньнямі пасобных родаў войск і праверка баявой загартаванасьці студэнцтва. Часьці Менскага гарнізону правялі тры паказныя вучэньні: арганізацыя наступленьня стралковай роты, і дзеяньні коннага эскадрону і артбатарэі. Пры студэнцкіх калёнах знаходзіліся вайсковыя кіраўнікі, якія дакладна тлумачылі студэнтам дзеяньні вайсковых часьцей.

Ня гледзячы на дрэнпае надвор'е, удзельнікі паходу зьявіліся ўсе і своечасова. На паходзе назіралася добрая дысцыплінаванасьць і зацікаўленасьць вучобаю.

Сувязь з замежнымі навуковымі ўстановамі

Дацэнт Старабінскі атрымаў паведамленьне аб абраньні яго ў лік членаў Інтэрнацыянальнай аданталёгічнай акадэміі ў Вашынгтоне. Акадэмія налічвае 200 членаў ва ўсім сьвеце.

СССР прадстаўлен у акадэміі 4-ма навуковымі працаўнікамі.

МЦРК купляе мяшкі

МЦРК прыступіў да закупкі мяшкоў. Мяшкі прымаюцца ўсімі крамамі і ларкамі ЦРК па 40 кап. за цэлы мяшок і па 30 кап. за мяшок, які патрабуе падлады. Праўленьне МЦРК зьвярнулася са спэцыяльным лістом да каапэрацыйнага актыву аб удзеле ў кампаніі па зборы мяшкоў.

— **ПЛЕНУМ САВЕТУ АЎТАДОРУ БССР. ЦП Аўтадору склікае на 18 лістапада пленум савету Аўтадору БССР. На пленуме будзе заслухана справаздача ЦП і пяцігадовы плян разьвіцьця дарожнага будаўніцтва і аўтамабілізацыі БССР.**

Тэатр і кіно ў Кастрычніцкія сьвяты

Усе дзяржаўныя тэатры Беларусі рыхтуюць да Кастрычніцкіх сьвят лепшыя п'есы свайго рэпэртуару. БДТ-1 (Гомель). 7-га лістапада ставіць новую п'есу «Міжбур'е». БДТ-2 (Віцебск) рыхтуе п'есу «На прадвесьні». Яўрэйскі дзяржаўны тэатр (Менск) 7-га лістапада ставіць п'есу «Барацьба мацных».

Усе білеты на гэтыя дармовыя спэктаклі ў Менску будуць перераданы культадделу ЦПСБ для разьмеркаваньня паміж членамі прафсаюзаў, іх сем'яў, беспрацоўных і чырвонаармейцаў.

* * *

Белдзяржкіно выпусьціла да сьвята 3 новыя культурныя фільмы. Фільм «Новы горад», які малюе сацыялістычнае будаўніцтва на Гомельшчыне, пасылаецца ў Гомель, фільм «Калектывізацыя» будзе дэманстравацца ў Клімавіцкім, Слуцкім раёнах. Фільм «Першы год пяцігодкі» будзе дэманстравацца ва ўсіх тэатрах гор. Менску.

* * *

На Пляцы Волі ўстанаўляецца адкрыты экран для дэманстраваньня фільмаў рэвалюцыйнага зьместу.

* * *

7-га лістапада ва ўсіх кіно-тэатрах адбудзецца дармовыя сэансы для членаў прафсаюзаў, іх дзяцей і беспрацоўных. Мяркуецца прапусьціць каля 8 тысяч чалавек.

Спэцыяльнай камісіяй в прадстаўнікоў Галоўрэпэрткому, прафсаюзаў, галоўмастацтва праглядзены эстрадны рэпэртуар. Выбраны найбольш каштоўны рэпэртуар для выступленьня ў дні Кастрычніцкага сьвята.

* * *

Арганізуецца 7 артыстычных брыгад, якія пад кіраўніцтвам музтэхнікуму будуць абслугоўваць клюбы, прадпрыемствы і ўстановы. У брыгады ўваходзяць канцэртная група Беларускага ўнітарнага тэатру, яўрэйскай і беларускай капэлы і студыйцы белмузтэхнікуму.

ЗА ДЗЕНЬ

Рэгістрацыя спэцыялістых на біржы працы. За апошні час на біржы працы зьяўляецца для папярэдняй рэгістрацыі ў якасьці эканамістых асобы з юрыдычнай асьветай. Прэзыдыум Бел. МБІТ прызнаў, што ў пасрэдбюро падлягаюць рэгістрацыі ў якасьці эканамістых асобы, якія атрымалі вышэйшую эканамічную асьвету, асобы, што скончылі другую ВНУ, але вялі эканамічную работу на працягу ня менш 3-х год.

Загатоўкі рызьля. Эканомнарада зацьвердзіла плян загатоўкі рызьля па БССР на 29-30 год у колькасьці 14.000 тон на суму 1.845.000 руб.

Прафшколы для друкароў. Учора пры ЦП саюзу друкароў адкрылася новая прафшкола на 40 чалавек.

Падлік пазбаўленых права голасу. Цэнтральная выбарчая камісія разам з НКУС распрацоўвае інструкцыю аб парадку вядзеньня пастаяннага падліку пазбаўленых права голасу на месцы іх жыхарства, а таксама і пры пераездах з аднаго раёну ў другі.

Нядбайнасьць Белмясгандлю да захаваньня мясных прадуктаў

Кожнаму вядома, што зараз, у перыяд харчавых цяжкасьцяй, трэба вельмі ўважліва адносіцца да захаваньня прадуктаў.

Але, як відаць, ня ўсе яшчэ зразумелі важнасьці гэтага пытаньня.

Кожны месяц з дастаўляемых на Менскую разьніцу кабаноў да 8-10 проц. прыходзіцца бракаваць, як фіновых і хворых. Адзін толькі Белмясгандаль церпіць да 4.000 руб. страт у месяц ад гэтых фінозных сьвіней.

Пасьля доўгіх клапот і перагавораў была выпісана з Нямеччыны спэцыяльная машына — стэрылізатар. Усе мікробы хворай сьвініны, калі яе прапусьціць праз гэту машыну, убіваюцца і мяса можна спажываць.

Ужо 3 тыдні, паводле слоў трэсту, як машына прыбыла. Па нашых вестках, машына стаіць на разьніцы 2 месяцы. Адміністрацыя разьніцы і дырэкцыя трэсту ўсё падшукваюць месца, дзе паставіць машыну.

Трэба было-б каму-небудзь зьвярнуць увагу на такую хуткую распаддачасьць Менсельпрому і дырэкцыі разьніцы. Дзякуючы такому «хуткаму» вырашэньню гэтага пытаньня прападаюць тысячы дзяржаўных рублёў і шмат жывёлы.

Аб нарадзе прафактыву

З мэтаю ўвязкі работы ячэек МОПР'у з фабзаўмясцкомамі Менакругком МОПР'у ўжо ня першы раз склікае нарады прафактыву. Але, на жаль, на гэтыя нарады прафактыў не зьяўляецца.

На нарадзе прафактыву 31-га кастрычніка з усіх 100 чалавек, што сабраліся, аказаліся ўсяго 4 прафактывістыя. Усё-ж, нарада адбылася і нават вельмі дзелавіта і актыўна вырашыла ўсе пытаньні.

Нарада пастанавіла Кастрычніцкія ўрачыстасьці шырока скарыстаць для правядзеньня чарговых задач МОПР'у (усесаюзны агляд, зімовая кампанія дапамогі, месячнік вярбоўкі сялян у рады МОПР'у).

Нарада ўхваліла ініцыятыву АК МОПР'у па зборы мяшкоў для загатоўкі бульбы, асабліва падкрэсьліваючы ў часе збору мяшкоў **прытрымлівацца добраахвотнасьці, ні ў якім разе не дапускаючы браць грошы замест мяшкоў. Такія выпадкі мелі месца.**

Збор мяшкоў сапраўды ператварыўся ў шырокую кампанію. Так, напрыклад, швэйтраст аддае ўсю тару (рагожа, палатно ад кіпаў), якая ёсьць, а таксама тую, што паступіць на працягу 10 дзён, у карысьць МОПР'у. Ячэйка МОПР'у пабудовы унівэрсытэцкага гарадка выявіла каля 1.000 мяшкоў, якія валяліся бяз усякай карысьці, і гэтыя мяшкі здае АК МОПР'у. Менакругком МОПР'у перадаў ужо Саюзхлебу частку сабраных мяшкоў.

Факт няяўкі прафактыву на мопраўскую нараду сьведчыць аб незацікаўленасьці прафарганізацыі мопраўскай працай, аб чым нарада пастанавіла напісаць у газэту.

Бібліяграфія

„СУЧАСНАЕ ПРАВА"

Том I.

ЗБОРНІК ПРАЦ. АДДЗЕЛУ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК БАН

У томе 1 зборніку **«Сучасное права»,** працы аддзелу гуманітарных навук Беларускай Акадэміі Навук зьмешчана праца С. Слупскага **«Асноўныя моманты разьвіцьця і склад сучаснай злачынасьці ў БССР».** У гэтай працы аўтарам паданы вельмі вялікі статыстычны матар'ял аб злачынасьці ў БССР, іншых Саюзных рэспубліках і капіталістычных дзяржавах. Але якасьць матар'ялу, камэнтаваньне яго і некаторыя вывады аўтара носяць ня ўсюды вытрыманы характар. Возьмем некалькі прыкладаў.

Аказваецца, што мы маем «адліў збытачнай часткі моладзі (да 24-х гад. узросту) у русло злачынасьці». Гэты адліў «зьвязаны з псыхічным жыцьцём маладога пакаленьня і в неўраўнаважанасьцю іх сьветапогляду» (стар. 106). Нам здаецца, што гэтыя матывы ня вычэрпваюць сутнасьці справы. Спрэчнае пытаньне «адліву», бо лічбы рэцыдыву па маемасных злачынствах, якія падае аўтар на стар. 170, не даюць належных падстаў залічваць моладзь «у русло злачынасьці». Гэта ня грунтоўны аналіз.

На стар. 116 аўтар, характарызуючы высокую злачынасьць у Канадзе, кажа аб «адсутнасьці сувязі паміж пакаёвымі багацьцем краіны і злачынасьці». На стар. 118 аб ніжэйшай, у параўнаньні з іншымі краінамі, злачынасьці ў Японіі, — аўтар тлумачыць гэта «вынікам значна актыўнага балянсу, які стварыла вайна ў Японіі». Наіўняя супярэчнасьць. «Сацыяльна-клясавы склад асуджаных прадстаўляе сабою сур'ёзную, паважную праблему ў вывучэньні фактараў злачынасьці», кажа аўтар на стар. 122.

Якія-ж сацыяльныя групы разглядае аўтар у сваёй працы. Гэта — «сельскія гаспадары, іншыя гаспадары, служачыя, рабочыя, прыслугі (??), беспрацоўныя, іншыя дэклясаваныя». І на ўсім працягу працы аўтара мы сустракаемся толькі з гэтымі групамі. Ці дае гэткае разьмеркаваньне досыць падстаў, каб дакладна вывяць «клясавыя суадносіны».

Сельскія гаспадары ў агульнай колькасьці складаюць паступова ў 1924, 1925 і 1926 г. г. — 70,1; 79,3; 78 проц. асуджаных за ўсе злачынствы (стар. 123). Наогул сельскія гаспадары. Ніякага ўнутрыклясавага падзелу ў гэтай «кампактнай», паводле думкі аўтара, масе «гаспадароў», паводле аўтара, няма. Кулак, серадняк і бядняк стрыгуцца аўтарам пад адзін грэбень. Вось вам вырашэньне праблемы в пункту погляду сацыяльна клясавага складу асуджаных.

І толькі за адно адкрыцьцё мы павінны дзякаваць аўтара. На стар. 128 ён нас радуе, што «наогул, па злачынствах супроць дзяржавы меры сацыяльнай абароны прыстасоўваюцца ў працягу трох апошніх гадоў (падкрэсьлена намі. Н) в улікам сацыяльнага становішча асуджаных». Але і гэтае добрае ўражаньне аўтар разьбівае на стар. 133, дзе ён кажа, што «гаспадары сельскае гаспадаркі, за злачынствы (супроць парадку кіраваньня прысуджаліся на працягу трох гадоў, амаль што адноль кава, да тэрміновага пазбаўленьня волі». Такія «ісьціны» падносіць нам аўтар.

Мы чулі ад Слупскага аб асобнай сацыяльна —клясавай групе «прыслугі». Нам здавалася, што такая сацыяльная група, пад такою назваю, Кастрычніцкай рэвалюцыяй зьнішчана. Але сёньня яшчэ аўтар на працягу ўсяго артыкулу гэты тэрмін ужывае.

Пасьля гэтых «пэрлаў» далейшае чытаньне працы робіцца вельмі цяжкім.

Наогул, паводле нашай думкі, праблему вывучэньня фактараў злачынасьці, выходзячы з сацыяльна - клясавага складу асуджаных і наогул з сацыяльна-эканамічнага пункту погляду, аўтар ня вырашыў. Асноўныя моманты разьвіцьця і складу злачынасьці патрабуюць больш вытрыманага, ясна выпрацаванага клясавага падыходу да свайго вывучэньня.

Н.

109 новых кіно-ўстановак

Белдзяржкіно пашырае сваю дзейнасьць

Намесьнік дырэктара Белдзяржкіно тав. **Матусаў** інфармаваў прэзыдыум ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва аб перспэктывах работы Белдзяржкіно. У 1929-30 годзе будзе выпушчана 8 агульных новых фільмаў, 8 культасьветных фільмаў і 16 палітасьветных фільмаў-хронік. На падрыхтоўку кадраў адпускаецца 15.000 р. Рад працаўнікоў накіраваны ў Ленінград і Маскву на рэжысэрскае і сцэнарнае аддзяленьні кінематаграфічнага тэхнікуму.

Кіно-сетка на Беларусі павялічваецца на 109 кіно-ўстановак, з якіх 55 перасовак.

Плян Белдзяржкіно прадугледжвае зьніжэньне закупкі замежных фільмаў да 6 з палов. проц. Усе іншыя фільмы будуць савецкай вытворчасьці. Белдзяржкіно пераданы кіно-тэатры Гомелю, Бабруйску, Магілева і Воршы. Адкрываюцца фота-магазыны ў Гомелі і Віцебску для забесьпячэньня фота-апаратамі аматараў і фота-гурткоў. Да канца пяцігодкі будзе скончана пабудова новай кіно-фабрыкі. На даабсталяваньне кіно-фабрыкі ў Ленінградзе адпушчана 115 тысяч руб. У Менску канчаецца пабудова новага кіно-тэатру.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Сёньня, 2-га лістапада, а 8 з паловай гадзіне вечара адбудзецца пасяджэньне таварыства гісторыкаў марксыстых у Ленінскім габінэце Камбузу. Пытаньні: 1)Даклад ЮГАВА аб 3-юльскім рэжыме (сталініншчына) у адэнцы Ленін). 2) Арганізацыйныя пытаньні. Апрача членаў таварыства запрашаюцца настаўнікі студэнты і ўсе, хто цікавіцца.

Праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б пры ЦВК і СНК БССР адбываецца ў клюбе саматужнікаў (Ракаўская вуліца), а 6-й гадзіне ўвечары. Запрашаюцца ўсе рабочыя і служачыя.

— **ДОМ АСЬВЕТЫ.** Сёньня, а 7 г. ув. адбудзецца агульны сход яч. ЛКСМБ Працасьветы.

— **ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА.** У панядзелак, 4-га лістапада, ад 5 да 7 гадзін увечары ў Доме пісьменьніка (Савецкая, 68) адбудуцца заняткі марксыдка-ленінскага гуртка пад кіраўніцтвам тав. Сакерскай.

— **АПА** Менакругкому КП(б)Б даводзіць да ведама, што з 10-га лістапада пачынае сваю работу дэкадны камбуз (ранейшы нядзельны). У камбуз прымаецца партыйны актыў раённага акруговага, цэнтральнага маштабаў, а таксама партактыў савецкіх, прафэсійных, гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый такога-ж маштабу. У унівэрсытэце будуць існаваць тры аддзяленьні: гісторычнае, эканамічнае і філёзоўскае. Курс навучаньня—адзін год. Таварышы, якія жадаюць паступіць у гэты унівэрсытэт, павінны да 7-га лістапада падаць заявы ў РК КП(б)Б.

Мен. АК МОПР паведамляе, што сёньня, 2-XI, а 6-й гадз. увечары, у памяшканьні Мен. АК МОПР (Савецкая, 87, другі паверх) адбудзецца арганізацыйны сход т. т., вылучаных ячэйкамі МОПР'у на курсы МОПР-актыву. На курсы зьявіцца па адным актывістым ад кожнай ячэйкі.

Просьба не спазьніцца.

— Сёньня, 2-га лістапада сход сэкцыі па анты-рэлігійным выхаваньні. Пачатак а 7-й гадзіне.

Яўка настаўнікаў, якія запісаліся ў сэкцыю—абавязкова.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Пэдсавет і вучком 6-ай вячэрняй школы ўзвышанага тыпу з жалем паведамляюць аб сьмерці былага загадчыка школы

Рубіна Пэйсаха АБРАМАВІЧА

Замест вянка ўносім грошы ў суме 10 руб. на карысьць МОПР'у

Што зроблена на лістох рабселькораў

За прымушэньне да распуснага жыцьця гр. Паўлюкевіч, прыбіральшчыцу Бігосаўскага агенцтва Саўгандальфлёту, прыцягваецца да адказнасьці загадчык Бігосаўскім агенцтвам **Шварцар,** аб чым пісалася ў газэце «Зьвязда».

Менскім аддзяленьнем Белкаапсаюзу ўзбуджана справа ў Менскай акруговай пракуратуры **аб прыцягненьні да судовай адказнасьці** старшыні Пярэжырскага спажывецкага таварыства (Сьмілавіцкі раён) і старшыні Азьдзяніцкага спаж. т-ва (Барысаўскі раён) **за зрыў загатовак.**

Прыцягваецца да адказнасьці Менскай акруговай пракуратурай старшыня Копыльскага спажывецкага таварыства **за нядбайныя адносіны да падрыхтоўкі складаў для прыёму і хаваньня збожжа,** што высьветлена абсьледваньнем стану вбожжавых складаў, якія не адпавядаюць прызначэньню па сваім разьмеры і абсталяваньні.

Полацкай РСІ вычышчаны з савецкага апарату і пазбаўлены права голасу Шмуйловіч Гірша, як былы гандляр, які займаўся кантрабандай. **Шмуйловіч** працаваў у Расонскім раёне ў якасьці агента Белдзяржгандлю.

Справа аб безгаспадарчасьці ў Талачынскім сельска-гаспадарчым таварыстве накіравана сьледчым у Аршанскі акруговы суд з абвінавальным заключэньнем для разгляду.

Зьнята з працы і засуджана на 3 гады зьняволеньня нарсудом Быхаўскага раёну настаўніца Лазаравіцкай школы Ткачова за цэлы рад злоўжываньняў. Яна праводзіла шкодную працу ў школе.

Пацьвердзіліся факты аб загадчыку грашовай часткі Старобінскага РВК— **Кустановічу,** які зьяўляецца сынам гандляра. **Цяпер ён з працы зьняты.**

За зрыў 2-хтыднёвіка ашчадна-сьці і за нядбайнасьць да працы ў Капаткевіцкай паштовай канторы **Ганусэвіч зьняты з працы** Мазырскай акруговай РСІ. Начальнік Мазырскай акруговай паштовай канторы **Бойка,** які ў апошні час працаваў у Раслаўлі (Смаленскай губ.) па атрыманых вестках, зараз выключаны з партыі за бюракратычныя і антыпартыйныя паступкі.

Ня прынята ў Слуцкую школу тав. Голуб, бо не падыходзіць па адукацыі і ня была камандыравана акруговым камітэтам «Чырвонага Крыжу».

За злоўжываньні з пнямі лясьнік Бачкароў Неманіцкага лясьніцтва (Барысаўскі раён) прыцягваецца **да судовай адказнасьці** па заметцы селькора «Адзінаначальле».

Па заметцы «Студэнты—шкоднікі» выяўлена, што ў **Рохлінай Рахілі** незаконна лічыўся на ўтрыманьні яе брат, які **зараз зьняты з ліку едакоў Менцэрабкопам.**

Абвешчана адміністрацыйнае спагнаньне Менскай п.-т. канторай працаўніку чыгуначнага аддзяленьня сувязі **т. Масюкавенку** за грубыя адносіны да кліентаў.

Зьняты з пасады загадчых вытворчасьцю гуты імя Домбаля **Дрэвін** за п'янства. Таксама ён атрымаў партспагнаньне. Зараз працуе ля варштату.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ

гор. МЕНСКУ.

Галоўная кантора газэты **„ЗЬВЯЗДА"**

АПАВЯШЧАЕ,

што з прычыны ліквідацыі Бел. аддзяленьня выдавецтва «Известия ЦИК»—

з 1-га лістапада выдача газэт падпісчыкам па гарадзкому аддзелу будзе праводзіцца гарадзкім аддзелам газэтнага бюро

(Ленінская вул., будынак пошты) і праз абанэнтныя паштовыя скрынкі.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Субота, 2 лістапада. Спэктакль для саюзу будаўнікоў. Білеты ў саюзе і рабфаках. — *Д. Бергельсон* **ГЛУХІ**

Нядзеля, 3 лістапада. Адкрыты спэктакль. Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру. — *А. Вальфрис* **БОТВІН**

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — ПРЭМ'ЕРА. Вытворчасьць—„Межрабпом-фільм". МАСТАЦКІ БАЯВІК **РАЗЛОМ**. Звыш праграмы кіно-хроніка „Савкіно" № 56. Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ — **ЯК ЧАСАМ БЫВАЕ**. драма ў 6 частках. Звыш праграмы: хроніка „Савкіно" № 58. Пачатак 1 сэансу а 7 г. 15 м. Каса—ад 5 г.

КІНО Пралетары —) МАСТАЦКІ НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ (— **ГОРНАЯ БАЛЯДА**. драма ў 7 частках з пралёгам. Пачатак сэансаў роўна а 7 гадзіне ўвечары. Каса—ад 5 з пал. гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" Цікавы фільм выт. „Совкино" **Лясныя людзі** (УДЭ). Краязнаўчы нарыс у 5 ч. Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкино", прысьвечаная міжнароднаму юнацкаму дню ў Маскве. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і серадах ад 12 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу ад 2 гадз.

КІНО Спартак Гастролі папулярных сатырыкаў **С. М. і М. Г. Гудалавых** —) НА ЭКРАНЕ (— ОСІ АСВАЛЬД у выдатн. фільме **ГЭТА МОЙ ЖАНІХ** камэдыя ў 6 част. Каса—ад 5 г. Пачатак 1 сэансу а 6 г. 30 м.

Сёньня і заўтра **АПОШНІЯ 2 ГАСТРОЛІ** ІЛЮЗІЯНІСТАГА-ГІПНАТЫЗЁРА **КАСФІКІС** ЦЫРК ЦЫРК

Масавы гіпноз, ваза Фараона. Зьяўленьне ўсяго штату на вачох у публікі. Зусім новыя вопыты.

КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ўноў запрошаных артыстых Маскоўскай і Ленінградзкай эстрады

Пачатак а 8 з пал. гадз. увеч.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА- САНІТАРНАГА Т-ВА

Ленінская, побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-66

АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч

Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраных, хірургічных, жаночых, зубных, вока, кроваў, вуха, горла, носа і скуры

ПРЫМАЮЦЬ ПА ПАПЯРЭДНІМ ЗАПІСЕ

Па хваробах вока—праф. Камінскі па панядзелках і чацьвяргох ад 3 гадз. дня.

Па хваробах вуха, горла і носа—праф. Бурак—па пятніцах з 3 гадз. дня.

Па жаночых хваробах—праф. Выдрын—па чацьвяргох з 7 гадз. увеч.

Па хірург. хваробах—праф. Рубашоў—па пятніцах з 6 гадз. увеч.

Па страўн.-кішэчн.—дацэнт Манасзон на аўторках і чацьвяргох ад 8 гадз. увеч.

Па хваробах скуры—д-р Розэнталь па аўтораках і суботах ад 8 г. увеч.

Па ўнутр. хваробах—праф. Мелніх—па чацьвяргох ад 6 г. увеч.

Па ўнутр. хваробах—праф. Гаусман па серадах ад 6 г. увеч

Па хірург. хваробах—праф. Саналоўскі—па чацьвяргох ад 6 г. увеч.

Па нэрвовых хваробах—праф. Кроль—па чацьвяргох ад 6 гадз. увеч.

Фізіятрычны габінэт: нарм. электра і сьвята-лячэньне.

Рэнтгенаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых. Прыём хіміка-бактэрыял. аналіза ў

Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.

— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

ШТО ТАКОЕ **АБЛОМАК ІМПЭРЫІ** ???

Чытайце заўтра абвесткі і афішы

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ Акц. Т-ва „Оргстрой"

вул. Энгэльса, № 8, тэлеф. № 611

Выкананьне **рацыяналізатарскіх** работ па тэхніцы кіраўніцтва, розьнічным гандлі, бухгальтарскім вучоце і справаводзтве.

Забесьпячэньне устаноў рацыянальнай мэбляй, абсталяваньнем і фармулярамі

з 1-га лістапада адчынены **МАГАЗЫН** на Пляцы Волі № 15, тэлеф. № 16-08

Прадстаўніцтва выдавецтва

„Тэхніка кіраўніцтва".

Вялікі выбар кніг па пытаньнях рацыяналізацыі і ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на ЧАСОПІСІ „Тэхніка Кіраўніцтва", „За рацыяналізацыю", „Вестнік стандартызацыі" і „Навасьці літаратуры па тэхніцы кіраўніцтва".

Іншагароднія заказы просім адрасаваць: гор. Менск, вул. Энгэльса, № 8.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

Менск, Савецкая, 63.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ

„ПОЛЫМЯ"

беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі

№ 8—9 (ЖНІВЕНЬ-ВЕРАСЕНЬ) 1929 г.

ЗЬМЕСТ:

П. Труо.—Смутак каханьня. Урывак з паэмы «Сірата Алеся»
Я. Неманскі.—Драпежнікі. Раман (працяг)
М. Чарот.—Восень сыпле пажоўклае лісьце. Верш.
Ул. Хадыка.—Сярод дарог. Верш.
Ал. Звонак.—На Волзе. Верш.
Андрэй Упіт.—1905 г. Драма ў 4-х актах.
Ю. Лявонны.—Далёкі рэйс. Паэма.
Арк. Кулашоў.—Узбэцкія матывы. Верш.
Алесь Жаўруки.—* * * Верш.
А. Санькевіч.—Аб чарговых задачах «Полымя».
Л. Бэндэ.—Памяці І. М. Фрычэ.
М. Аляхновіч. — Паэта буйных ветразей сучаснасьці.
К. Пушкарэвіч.—Польшча і Францыя.
У. Пічэта.—Сялянскія рухі на Беларусі пасьля аграрн. рэформы 1861 г.
І. Цьвікевіч. — Выяўленчае мастацтва ў масы.
М. Цыганоў.—Да біяграфіі М. Багдановіча.
А. Паўлов